РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 СНЕЖНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 245 (30633)



Фота БелТА.

# ЧАС КАНКРЭТНЫХ СПРАЎ

Галоўнай падзеяй першага дня другога пасяджэння VII Усебеларускага народнага сходу, несумненна, стала пасланне Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту. Паводле абноўленай Канстытуцыі кіраўнік дзяржавы звяртаецца з ім менавіта падчас пасяджэння найвышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя.

Паслання Прэзідэнта ў Беларусі заўжды чакаюць. Людзі ведаюць: Аляксандр Рыгоравіч будзе гаварыць пра самыя надзённыя для краіны праблемы і пра тое, як іх вырашаць, пра тое, што хвалюе яго як Прэзідэнта і як чалавека. Так было і гэтым разам. Акрамя дэлегатаў і запрошаных у Палац Рэспублікі гасцей, зварот кіраўніка дзяржавы па прамой трансляцыі слухалі ва ўсіх кутках Беларусі. Прэзідэнт, як заўсёды, шчыра, расказаў нам пра нас саміх — і гэта менавіта тое, што прыцягвае такую масавую ўвагу да яго выступлення з Пасланнем.

З дэлегатамі УНС Прэзідэнт доўга размаўляў і пасля выступлення, адказаў на ўсе іх пытанні. Гэта была шчырая гутарка людзей вельмі розных, але якія маюць адну мэту — каб родная краіна і яе народ жылі ў міры і дабрабыце.

Першы дзень пасяджэння сёмага УНС доўжыўся чатыры гадзіны сорак хвілін. Аб усім падрабязна — у сённяшнім нумары.

ЧЫМ СЁЛЕТА ЗДЗІВІЦЬ ВЫСТАЎКА НАШЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ

20




Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X



Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2026 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2026 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# ЧАС КАНКРЭТНЫХ

## Выступленне Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі на другім пасяджэнні сёмага Усебеларускага



***Паважаныя суайчыннікі! Паважаныя дэлегаты Усебеларускага народнага сходу! Запрошаныя госці.***

Паколькі эканоміка — аснова нашага жыцця, адразу папярэджваю, што будзе сумна і камусьці нецікава. Таму я пастараюся свой зварот зрабіць як мага карацейшым.

Завяршаецца бягучы 2025 год. Выніковы ў нашай пяцігодцы. Значны для нас, з улікам таго, што праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, бягучую праграму, мы распрацоўвалі і прымалі ў перыяд беспрэцэдэнтна агрэсіўнага глабальнага парадку дня. У перыяд палітычнага і эканамічнага передзелу свету, які да гэтага часу не скончыўся, набірае абароты.

Згадайце шэраг падзей, праз якія нам прыйшлося прайсці за вельмі кароткі час. Ковідны лакдаўн — пандэмія. Паўсюдна найважнейшыя эканамічныя працэсы — пастаўкі тавараў, вытворчыя ланцужкі, адпрацаваная лагістыка, транспартныя патокі — усё гэта было пастаўлена на зацяжную паўзу. Закрыццё Еўрасаюзам неба для «Белавія». Ну вы падрабязнасці чулі, ведаеце, за якія супраць нас увялі санкцыі. Але пасля падрабязнасцяў гэтых, якія мы абнародавалі, ніхто так і не папрасіў прабачэння. Увядзенне Захадам новых незаконных санкцый супраць Беларусі, адключэнне ад SWIFT, блакіроўка доступу да марскіх партоў, гандлёвае эмбарга і закрыццё граніц. Усё разам — не лепшы фон для амбіцыйных задач. Мы дамовіліся тады: ніякіх спасылак на санкцыі. Не было часу мусоліць гэтыя тэмы, трэба было змагацца за кожны экспартны рубель.

**У 2020 годзе мы паставілі планку па нарошчванні экспарту да 50 мільярдаў долараў. У выніку не проста атрымалі гэту лічбу, але і працягнулі весці гандлёвыя адносіны амаль са 190 краінамі свету. Захад не ўлічыў аднаго: свет велізарны. Ніхто пад неакаланіяльную дудку больш скакаць не будзе.** Глабальны Поўдзень і Азія сталі новай рэальнасцю. Сёння ў краіны Блізкага Усходу і ў Афрыку, Кітай і Лацінскую Амерыку едуць нашы сельгастэхніка і грузавікі, малочная і мясная прадукцыя, шыны, камплектуючыя — спіс тавараў вялікі.

Мы зламалі міф, які ствараецца Захадам, аб закрытасці і ізаляванасці нашай краіны, што пацвярджаюць любыя сусветныя рэйтынгі.

**Беларусь увайшла ў топ-50 краін, якія найбольш наведваюць турысты: 48-е месца з 220 краін. Толькі сёлета больш за 250 тысяч дасведчаных еўеўрапейцаў прыехалі па бязвізе, асабіста пераканаліся ў бяспецы і ўтульнасці, а таксама прыгажосці нашай Беларусі.**

Гэта пры закрытых больш за палову пагранічных пунктах. Мы захавалі і прымножылі моцны рэальны сектар эканомікі, нічога не загубіўшы і не страціўшы з савецкай спадчыны. У сусветным рэйтынгу канкурэнтаздольнасці прамысловасці займаем 56-ю пазіцыю сярод паўтары сотні краін. Хоць над прадукцыйнасцю працы яшчэ трэба сур'ёзна працаваць.

У такі няпросты час айчынныя прадпрыемствы працягвалі актыўна ўкладвацца ў тэхналагічнае развіццё і мадэрнізацыю. Гэта задзел на будучыню. У бягучай пяцігодцы мы завяршылі рэалізацыю амаль тысячы вытворчых праектаў. Пры тым што ў неабходных аб'ёмах будаваліся і жыллё, і дарогі, аб'екты сацыяльнай, спартыўнай інфраструктуры. Паспяхова сябе зарэкамендавала ініцыятыва «Адзін раён — адзін праект», даўшы больш за 6 тысяч новых працоўных месцаў у невялікіх гарадах і населеных пунктах. І далей гэта праграма будзе прадоўжана. Стане адной з ключавых у нашай краіне.

**За гэтыя гады рэальная заработная плата вырасла на 40 %, дасягнуўшы сярэдняга значэння 2700 рублёў. На працягу ўсяго пяцігоддзя двойчы за год павышаліся пенсіі. Апярэджваючы выпады скептыкаў аб макраэканамічных дысбалансах, скажу: у нас стабільная, нармальная эканоміка.**

Даўгавая нагрузка зніжаецца, золатавалютныя рэзервы знаходзяцца на гістарычным максімуме, заслужана вырас давер да нацыянальнай валюты. Улічваючы зыходныя ўмовы, аб якіх сказана ўпачатку, вынікі для звыклага жыцця людзей у цэлым прымальныя. Забяспечана стабільная занятасць, годны ўзровень даходаў і, самае галоўнае, бяспека.

Падчас сходу нам трэба будзе вызначыць асноўныя кірункі развіцця краіны на наступныя пяць гадоў. Перш чым мы пазнаёмімся з распрацаваным урадам праектам, я хацеў бы нагадаць базавыя, асноўныя ўстаноўкі, якім павінен адпавядаць гэты дакумент, — нашы праграмы. Яны ідуць ад жыцця і вельмі актуальныя.

Аснова асноў, як я ўжо сказаў, — эканоміка. Гэта галоўная зброя ў сучасным свеце. Нам патрэбны базіс для выканання праграмы наступнай пяцігодкі, у якую закладзены амбіцыйныя планы і паказчыкі. Калі хочам стабільна выйсці на 100 мільярдаў долараў гадавога валавога ўнутранага прадукту і сярэднямесячную зарплату ў тысячу долараў, павінны ўстойліва працаваць прадпрыемствы і фінансавая сістэма.

У свеце тры полюсы сілы: Кітай, Расія, Злучаныя Штаты Амерыкі. На самай справе лічаць чацвёртай апорай і Еўрасаюз. Але з улікам іх унутранага раздраю і істэрычных патрабаванняў полюс можа абрынуцца. Цэнтрам новага прыцягнення становіцца Індыя з найвышэйшымі тэмпамі эканамічнага развіцця. Таму няма нічога дрэннага ў тым, што, маючы бліскучыя стратэгічныя адносіны з Расіяй і Кітаем, мы пачалі выбудоўваць канструктыўны дыялог з кіраўніцтвам Злучаных Штатаў Амерыкі. Нагадаю,

# СПРАЎ

## народнага сходу пры звароце з Пасланнем беларускаму народу і парламенту

гэта адзін з наймагутнейшых галоўных цэнтраў сілы. Так, дыялог часам жорсткі, упарты. Так, важныя любыя дробязі. Але гэта перагаворы моцнага з моцным. Павага і аўтарытэт нашай краіны не ставяцца пад сумненне, і мы цвёрда стаім на сваіх пазіцыях. Беларусь — наш дом. Толькі мы вызначаем свой эканамічны ўклад. Ён даўно сацыяльна арыентаваны, і тыя ж амерыканцы — вялікія рынкавыя капіталісты — ні разу за ўсе перагаворы не патрабавалі ад мяне зламаць гэту мадэль або сысці ад яе. Яны ж не сляпыя: бачаць, якая ў нас краіна — дарогі, чыстыя гарады, нармальныя аўтамабілі. Мы сапраўды рэалізуем свой беларускі шлях разам. Усе задачы ставім зыходзячы з уласных інтарэсаў і досведу, але разумеючы, што гарантаваць іх выкананне можа толькі суверэнная дзяржава.

А што прапануюць нашы збеглыя з падачы сваіх гаспадароў? Нядаўна выйшаў гэты дакумент, таму, прабачце, ужо дазволю некалькі слоў аб ім сказаць. Літаральна месяц таму «свядомыя» офісы ў Літве, Варшаве прэзентавалі чарговы гучны план, цытую, «Адраджэнне беларускай эканомікі». Там чатыры асноўныя пункты, або раздзелы. Першы. Падключэнне да еўрапейскай энергетычнай сістэмы. Прыйдуць да ўлады, падключаць да энергетычнай сістэмы Еўропы. Можаце ўявіць сабе аднамомантны рост электратарыфаў як мінімум у 4-5 разоў з далучэннем да санкцый па расійскім газе і нафце? Другі. Шырокая прыватызацыя і распродаж дзяржаўнай уласнасці. Каментарыі залішнія. Відаць, для гэтага іх гадамі і ўтрымліваюць на грантах і ручным кіраванні заходніх спецслужбаў. Ну хто ж бясплатна будзе там карміць? Пад абяцанне, што ўсё раздадуць. Трэці. Фінансавая незалежнасць за кошт крэдытаў міжнародных арганізацый. Супярэчнасць і глупства ў адной прапанове. Калі гэтыя арганізацыі працавалі ў Беларусі, то ў вялікім альтруізме яны заўважаны не былі. Калі танны крэдыт — купляй канкрэтнае заходняе абсталяванне, якое сёння даражэйшае і за кітайскае, і за індыйскае. Не хочаш — не бяры, не будзе крэдытаў. І чацвёрты. Адно слова: лічбавізацыя. Модна. Без усялякіх тлумачэнняў. Мабыць, проста моднае слоўца, якое трэба ўставіць у любы план. Па сутнасці, гэта здача суверэнітэту Беларусі і развал яе эканомікі пад знешнім кіраваннем. Нічога за шмат гадоў не змянілася: усё тая ж бойка за нейкія крэслы, пасады, фінансавыя падачкі.

> **Таму мы сціснуўшы зубы заўсёды змагаліся за захаванне сваіх вытворчасцяў і прамысловай асновы развіцця краіны. 15 гадоў мы займаемся імпартазамяшчэннем, якое ператвараецца ў імпартанезалежнасць.**

Ніколі не стаяла задача вырабляць у Беларусі абсалютна ўсё. Але там, дзе ў нас ёсць мясцовая сыравіна, навуковыя задзелы, школы, мы будзем літаральна выгрызаць свае інтарэсы ў найскладанейшай і не заўсёды сумленнай канкурэнцыі. Абсалютна несумленнай канкурэнцыі. Тым больш што ў нас з'явілася свая атамная станцыя. Гэта дазволіла ўмацаваць энергетычную самастойнасць краіны амаль у два разы, даць самыя канкурэнтныя ў Еўропе тарыфы вытворчым прадпрыемствам, адкрыць новыя галіны: электраацяпленне жылля, электратранспарт, назапашвальнікі энергіі, майнінг, крыптарынак. Вырабляем уласныя камп'ютары і маніторы. Паспяхова асвоілі выпуск новых відаў прадукцыі ў машынабудаванні — ад магутных энерганасычаных трактароў да беспілотных БЕЛАЗаў. Фактычна з нуля стварылі ў краіне вытворчасць легкавых аўтамабіляў, запусціўшы серыйную лінейку на любы густ. Сотні тысяч айчынных машын рэалізаваны на агульным рынку Саюзнай дзяржавы. Асобныя мадэлі займаюць у продажах першыя радкі. У Мінску пабудавалі новы аўтобусны завод МАЗ. Сёння прадпрыемства гатова штогод выпускаць да трох тысяч камфартабельных машын у сучасным дызайне — вы гэта ўсё бачылі і ведаеце. На аснове сучасных тэхналогій нарасцілі ўласную здабычу нафты. Паглыбіўшы перапрацоўку нафтавай сыравіны, наладзілі выпуск нафтавага коксу і іншых відаў нафтапрадуктаў. Вырабляем лекі для анкахворых, амінакіслоты, інавацыйныя біяпрадукты. У сферы харчовай прамысловасці разгарнулі вытворчасць ад унікальных сухіх сумесяў для немаўлят — вельмі запатрабаваных безлактозных малочных прадуктаў — да элітных сыроў і мясных далікатэсаў. Усё гэта вынік вялікай шматгадовай працы ўсіх беларусаў, ад сельскага работніка да вучонага. Нашай з вамі працы.

У той жа час нявырашаных эканамічных задач хапае.

**Першае. Тэхналагічны суверэнітэт.**

Я свядома аддаю яму прыярытэт, паколькі нас выдатна загартаваў досвед так званага супрацоўніцтва з Захадам. Пад рознымі соусамі нас мэтанакіравана і планамерна ставілі ў сітуацыю залежнасці ад заходняга абсталявання і нават дробных камплектуючых. Мы ўбачылі, як важна мець уласныя распрацоўкі ў крытычна важных галінах эканомікі. Цяпер проста абавязаны вяртаць вытворчасць у новай якасці або з нуля ствараць сваё ў мікраэлектроніцы, робататэхніцы, фармацэўтычнай галіне, беспілотных сістэмах і гэтак далей. Так, магчыма, сёння гэта складана, вельмі дарага, але заўтра гэта акупіцца шматкроць. Без гэтага проста нельга. Часу на разварушванне ў нас няма. Асабліва важна ў рэальным сектары павышаць хуткасць укаранення перспектыўных распрацовак. Краіне патрэбны праекты, якія базіруюцца на распрацоўках і адкрыццях айчынных навукова-вытворчых школ.

Роля даганяючых асабліва недапушчальная ў развіцці мікра- і радыёэлектронікі. Наша задача-мінімум — забяспечыць айчыннымі мікраэлектроннымі кампанентамі сваю прамысловасць і ваенна-прамысловы комплекс. І гэта ж наша тэма. Мы тут даўно працуем. Яшчэ адна канкрэтная задача — штогод выпускаць новыя мадэлі станкоў з праграмным кіраваннем пад поўную патрэбнасць нашых прадпрыемстваў і выходзіць на сусветныя рынкі. Мы ж машынабудаўнічая краіна. Без сучасных станкоў — якое машынабудаванне?

Зноў жа наша тэма з савецкіх часоў — станкабудаванне. Таму галіновыя міністры, кіраўнікі сумесна з вучонымі павінны ўзгадніць праграму і планы новай пяцігодкі. Да 2030 года трэба павялічыць шчыльнасць рабатызацыі да 100 адзінак на 10 тысяч прамысловых работнікаў. Да 100 адзінак, ну, у свеце 150. Тым больш што дзяржава аказвае садзейнічанне — ад ільгот да ўжо падрыхтаваных вытворчых плошчаў. Адну з такіх унікальных пляцовак мы стварылі на тэрыторыі «Мотавела» — Мінскі гарадскі тэхнапарк. Любы прадпрымальнік можа прыйсці сюды са сваёй бізнес-ідэяй і адкрыць інавацыйную вытворчасць. Будзем пашыраць гэты фармат ва ўсіх рэгіёнах краіны. Працэс пайшоў.

**Другое. Лакалізацыя і кааперацыя.**

Як ужо казаў, зрабіць абсалютна ўсё немагчыма і не трэба. Але рацыянальна выкарыстоўваць патэнцыял супрацоўніцтва з усімі партнёрамі Беларусі, аб'ядноўваць вытворчыя кампетэнцыі, вырашаць задачы па ключавых тэхналогіях крытычна важна. У нас ёсць паспяховы вопыт рэалізацыі імпартазамяшчальных праектаў з Расійскай Федэрацыяй — ад мікраэлектронікі і авіябудавання да лакалізацыі аўтамабільных кампанентаў і вузлоў. Нямала агульных задум у партнёрстве з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Напрыклад, шэраг праектаў у цэлюлозна-папяровай прамысловасці. Сфера больш чым перспектыўная, дзе расце цікавасць іншых міжнародных гульцоў. Мы можам і павінны яе задаволіць. У нашай лясістай Беларусі сыравіны — драўніны — пад такія праекты маецца ў лішку. Таму ўсе лясгасы павінны быць забяспечаны айчыннай, шматфункцыянальнай лесанарыхтоўчай тэхнікай і пастаўляць на перапрацоўку не менш як 25 мільёнаў кубічных метраў круглай драўніны штогод. Пры гэтым давайце адзначым: чаму ў нас валяецца лес па ўсіх узлесках, а краіна на дзясяткі мільёнаў імпартуе мэблю, папяровую ўпакоўку і не можа масава пабудаваць танныя прафілакторыі для цялят.

*(Працяг на 4–13-й стар.)*



# ЧАС КАНКРЭТНЫХ

Туалетную паперу не можам зрабіць нармальную. Агіднае стаўленне адпаведных службовых асоб да гэтай галіны, у якую, між іншым, за мінулую мадэрнізацыю ўкладзена 2,5 мільярда долараў з улікам цэлюлозна-папяровага камбіната. Пакуль ні капейкі не вярнулі. Ці вы думаеце, вам нехта іх спіша? Выкіньце гэтыя думкі з галавы. Пра фінішную, мяшэчную, крафт-паперу ў Светлагорску вы ўжо пяць гадоў байкамі корміце ўвесь народ. Ужо які склад урада не можа паказаць рэальны эфект па нашай трыядзе сыравінных тавараў — драўніна, лён, гарбарная сыравіна. Ці вы абыякавыя людзі, ці ў вас увогуле няма ніякіх амбіцый. Без амбіцый нікуды...

Далей. Асаблівае месца ў прамысловасці займае машынабудаванне. Штогод з нашых канвеераў сыходзяць тысячы адзінак тэхнікі. Але ўсё яшчэ не маем уласнага бензінавага рухавіка, не асвоілі ўсю лінейку дызельных матораў. Значыць, патрэбны пэўны план мер, каб вырашыць гэтыя задачы. Сёння важна не ўпусціць сусветны трэнд развіцця электратранспарту. Трэба нарошчваць вытворчасць такой тэхнікі на новым заводзе МАЗ, у два разы павялічыць магутнасці «Белкамунмаша». Час «БЕЛДЖЫ» паднімаць планку і забяспечыць выпуск айчынных электрамабіляў і гібрыдаў як мінімум па 10 тысяч у год. Далей патрабуецца маштабаваць практыку запуску зборачных вытворчасцяў за мяжой. Рэалізуецца дамоўленасць аб лакалізацыі беларускіх трактароў і грузавікоў у В'етнаме. Створана сумесная вытворчасць тэхнікі БЕЛАЗ у Іране. Але поўнасцю вывозіць з краіны нашы заводы мы, вядома, не будзем. Такіх прапаноў па сумесных зборках вельмі шмат, асабліва ў Афрыцы. Патрэбны поўныя актуальныя пералікі праектаў прамысловай кааперацыі па краінах і неадкладнае іх выкананне на практыцы.

У будучым пяцігоддзі трэба рэалізаваць мінімум 25 буйных інвестыцыйных праектаў у прамысловым сектары. Мы маем перспектыўныя задумкі і напрацоўкі ў стварэнні беларускага цягніка ў Фаніпалі, айчыннага самалёта ў Баранавічах, рулоннага прэс-падборшчыка, даільнага робата, аднаўленне кампетэнцый суднабудавання на пінскім заводзе. Пакуль слабая прапанова па нафтахімічным комплексе, пасля мадэрнізацыі НПЗ прарыўных праектаў няма. Бачу, што паступова губіце і хімвалакно. Усе гэтыя вытворчасці вельмі важныя для будучыні Беларусі. Трэба фактычна ў ручным рэжыме кантраляваць усе названыя будоўлі.

> **На значныя праекты ў краіне заўсёды знойдуцца рэсурсы. Дарэчы, мы маем рэкордны запас золатавалютных рэзерваў.**

Сапраўды, ёсць неабходнасць мець такі аб'ём, як нам дыктуюць заходнія сістэмы. Мяркую, трэба перабудаваць стратэгію кіравання міжнароднымі рэзервовымі актывамі. Грошы павінны працаваць. І даходы, атрыманыя Нацбанкам ад кіравання рэзервамі, павінны быць укладзены ў рэальны сектар эканомікі, мадэрнізацыю вытворчасцяў, лакалізацыю асноўных імпартных камплектуючых і выгадныя экспартныя кантракты.

У апошняй камандзіроўцы маёй працяглай мы вельмі шмат са спецыялістамі, у якіх больш за ўсё валюты, грошай, шмат гаварылі пра грошы ў перспектыве. Яны мяне пераконвалі ў адным, і я з імі згодны, даўно пра гэта думаю, што гэтыя валютныя, вялізныя, трыльённыя рэзервы па ўсім свеце, ад Кітая, Эміратаў і гэтак далей, заўтра могуць аказацца нікому не патрэбнымі. Асабліва з той палітыкай, якую праводзіла былая адміністрацыя Злучаных Штатаў Амерыкі, і цяперашняя ад гэтага не адышла. Якая паклала і ў любы момант можа накласці лапу на любыя золатавалютныя рэзервы і зрабіць іх незаконнымі. Проста скрасці.

**Трэцяе. Развіццё нацыянальнай індустрыі высокіх тэхналогій, IT-індустрыі.**

Вопыт санкцый, калі ўмомант спынілася абслугоўванне праграмных прадуктаў, тэхналагічныя ланцужкі прадпрыемстваў былі пастаўлены пад пагрозу, стаў для нас яшчэ адным урокам. Мы пра гэта крыху гаварылі, з майго боку быў просты крок... Забаранілі гаварыць пра санкцыі. А яны нікуды не падзеліся. Вось адзін з кірункаў. Гэту ўразлівасць мы абавязкова ліквідуем. Крытычныя галіны павінны быць забяспечаны імпартанезалежным праграмным прадуктам мінімум на 90 %. Усё для гэтага ёсць. Прававое поле, інфраструктура, школа падрыхтоўкі IT-спецыялістаў, Парк высокіх тэхналогій. Ураду і Парку высокіх тэхналогій трэба больш актыўна фарміраваць цэнтры распрацовак у Беларусі, арыентуючы каманды айцішнікаў найперш на нацыянальныя праекты, а не падносіць патроны буйным кампаніям у Злучаных Штатах ці іншых краінах.

Далей. Лічбавізацыя ў паўсядзённым жыцці. Мы развіваем тэхналогіі электроннага ўрада, ствараем лічбавыя платформы і сэрвісы. Але ці бачны эфект насельніцтву? Ці разумеюць людзі, якія магчымасці адкрываюцца для іх зручнасці? Думаю, не заўсёды і не ўсе. Для чаго стварылі адзіны партал электронных паслуг, калі, акрамя Мінска і абласных цэнтраў, людзі не маюць магчымасці дыстанцыйна запісацца, напрыклад, да ўрача, вымушаны з 6 раніцы прыязджаць у паліклініку і чакаць у парадку жывой чаргі. У нас поўна гарачых тэлефонных ліній, парталаў, сайтаў, ад зварот. бел да чат-ботаў, а толку? Людзі як хадзілі, так і ходзяць ад адной арганізацыі да іншай. Прапрацуйце магчымасць стварэння адзінай службы, здольнай аператыўна і кампетэнтна рэагаваць на пытанні. Яна павінна стаць універсальным цэнтрам зваротнай сувязі з насельніцтвам, куды можна звярнуцца і па тэлефоне, і праз інтэрнэт, і асабіста. Падобны досвед ёсць і ў Расіі, і ў Кітаі. Я хачу падкрэсліць: мэта — не лічбавізацыя дзеля моды лічбавізацыі. Калі адміністрацыя паслугі даражэй, чым яе рэальная запатрабаванасць, то траціць грошы бессэнсоўна. Будзем спрашчаць там, дзе гэта рацыянальна.

Яшчэ адно надзённае пытанне — надзейная і хуткая сотавая сувязь. Да яе ёсць пытанні па ўсёй краіне. Сямейныя выдаткі на інтэрнэт ужо супастаўныя з іншымі камунальнымі плацяжамі. Вяду да таго, што пры сваіх немалых даходах мабільныя аператары павінны забяспечыць аднолькава стабільную сувязь у любым населеным пункце. Адгаворкі больш не прымаюцца. Ураду неабходна вырашыць гэту праблему літаральна на працягу наступнага года. Усе нарматыўныя акты, якія вы прасілі, мною падпісаны.

**Чацвёртае. Энергетычная самастойнасць.**

Энергетыка — гарант эканамічнага развіцця. Гэта пытанне самадастатковасці дзяржавы. Перавага Беларусі ў дадзеным аспекце відавочная. Пабудаваная АЭС сур'ёзна ўмацавала нашу энергетычную незалежнасць, але да трыццатага года трэба ўзняць гэты ўзровень яшчэ вышэй. Магутнасці станцыі дазволілі асучасніваць адпаведную інфраструктуру і стымуляваць развіццё электратранспарту. За гэты час мы падключылі два мільёны квадратных метраў новага электрыфікаванага жылля. Сучасныя беларускія электробусы курсіруюць не толькі ў Мінску і абласных цэнтрах, але і ў эксперыментальных раёнах — Жодзіне, Шклове, Наваполацку — пілотныя нашы праекты. Ураду, губернатарам трэба пашыраць такі вопыт паўсюдна. Запусціце да гарадоў-спадарожнікаў камфортныя, надзейныя электробусы, не забіваючы маршруткі. Хачу, каб мяне пачулі і тыя, хто «цік-токаецца» ў гэтых цік-токах. Я ніколі не быў супраць вольнага выбару чалавека, грамадзяніна, на чым яму перамяшчацца: на маршрутках ці на аўтобусах. Але калі людзі стаяць у чарзе і грамадзяне да мяне звяртаюцца, я на гэта не мог не звярнуць увагі. Мы неадкладна вырабілі нямала аўтобусаў, электробусаў на газаматорным паліве, на рухавіках унутранага згарання і запусцілі па маршруце. Выбірайце.

Яшчэ адно надзвычай актуальнае пытанне — надзейнасць энергетычных аб'ектаў. Міністэрству энергетыкі трэба не адкладваючы заняцца будаўніцтвам ліній усіх класаў напружання, а таксама падстанцый з разумным запасам магутнасці. Бо будзе генерыруючая станцыя — атамная электрастанцыя. А вось гэты прадукт давесці да насельніцтва мы не зможам. Правады старыя, па-народнаму кажучы. Падстанцыі ніякія. Тую магутнасць, якая патрэбна ў тым ці іншым раёне, вёсцы, не вытрымліваюць. Таму масава зараз працуем над пашырэннем энергетычных магчымасцяў. Раней, але я хачу, каб вы мелі на ўвазе, мадэрнізацыя будзе ісці строга ў рамках устаноўленага росту тарыфаў для насельніцтва і прадпрыемстваў. Людзі да гэтага прывыклі. Раней было пяць долараў за год, цяпер палова базавай велічыні, 21 рубель. Ніякіх скачкоў тут не будзе. І я хачу папярэдзіць урад: нават дзверы не адчыняйце тым спецыялістам ад энергетыкі, якія да вас прыходзяць і гавораць — не ўкладваемся. Вышэй за сабекошт, сабекошт вышэй за цану. Ну дык працуйце, каб сабекошт быў ніжэйшы. Курс вызначаны, у гэтым напрамку будзем дзейнічаць.

**Пятае. Устойлівая, прыбытковая вытворчасць прадуктаў харчавання.**

Галіна штогод прыносіць краіне мільярды долараў экспартнай выручкі. Сёлета больш за 9,5 мільярда долараў. У гэтым годзе дзякуючы зладжанай працы аграрыяў мы атрымалі адзін з самых высокіх ураджаяў збожжавых — 11 мільёнаў тон. І цукровых буракоў — 6 мільёнаў тон. Такога ніколі не было. А ўспомніце, які быў год. Калі на селектары вызначалі ўзровень збожжавых і нашы аграрыі заявілі аб 11 мільёнах, я так





# СПРАЎ

пагадзіўся, думаю, добра, няхай будзе 11. Паглядзім, ці вы дасягняце яго. Дасягнулі. У жывёлагадоўлі пераадолеем новую мяжу — зробім больш за 9 мільёнаў тон малака.

**Толькі ўдумайцеся ў гэтыя ўнікальныя лічбы. На кожнага беларуса атрымалі больш за адну тону збожжа і адну тону малака. Колькі такіх дзяржаў? Амаль няма.**

Разам з тым прабелаў у сельскай гаспадарцы нямала. Прычына ў паўсюднай адсутнасці тэхналагічнай, вытворчай дысцыпліны, у прыпісках і крадзяжы. Сумна. Гэта цягне цэлы шлейф праблем. Няякасныя кармы, догляд жывёл, хваробы і падзеж, безгаспадарчыя адносіны да дарагой сельгастэхнікі і гэтак далей. Усё гэта неабходна выкараніць у нашай практыцы. Не на працягу пяцігодкі, а літаральна за найбліжэйшы год.

Сёння ў першай палове дня ў мяне адбылася сур'ёзная размова з Прэм'ер-міністрам. І я звярнуў яго ўвагу на тое, што я разумею, учарашні губернатар, ён добра ведае праблему. І калі я яму называю негатыў, ён мне кажа: дык у нас вось там добра. А вось некаторыя раёны, у тым ліку ў Мінскай вобласці, дзе ён працаваў, ну гэта ўсяго 4 раёны, якія кувыркаюцца з году ў год. На што ён сказаў — добра. З 21, па-мойму, раёна, чатыры, ну можна ж парадак навесці ў чатырох раёнах. Закасцянелі, за агульнымі лічбамі не бачым канкрэтных праблем.

Вынікі Віцебскай нарады будуць відаць ва ўсіх рэгіёнах без выключэння. Я вам больш скажу, у мяне было жаданне для ўсіх дэлегатаў УНС апублікаваць сто старонак, том з недахопамі ў сельскай гаспадарцы па нарадзе ў Віцебскай вобласці. Але калі мне праект паклалі на стол, я ледзь не звар'яцеў. Думаю, калі гэта я цяпер нават для дэлегатаў УНС сакрэтным пісьмом накірую, ну дакладна мы правалім гэта пасяджэнне. Таму адказным асобам гэты стастаронкавы даклад накіраваны. Мы падумаем, што зрабіць далей, калі такое па краіне будзе працягвацца. Гэта недапушчальна. Дзікі падзеж маладняку, кароў, якія нас кормяць, і да таго падобнае. Калі накарміць жывёлу не можам, ну калі хтосьці не можа, ну забярыце, проста забярыце гэту жывёлу і адпраўце таму, дзе могуць накарміць. Такіх дастаткова гаспадарак. Не, усё валакіцяць. І потым крыўдзяцца на жорсткасць патрабаванняў і яшчэ нешта. **Адступлення не будзе. Настойліва рэкамендую далучыцца да гэтай работы ўсім зацікаўленым асобам. Час угавораў, тлумачэнняў скончаны. Толькі канкрэтныя справы і вынікі.**

Для АПК — гэта кардынальнае зніжэнне залежнасці ад імпарту. Важна стварыць у найкарацейшыя тэрміны селекцыйны генетычны цэнтр у птушкагадоўлі. Гэта не проста праект, гэта будучыня нашай птушкагадоўчай галіны. Дарэчы, лідара ў мясным сектары. Ну, калі проста казаць, мы столькі бройлераў і нясушак вырошчваем, столькі ў нас яек на кожнага чалавека. Груба кажучы, кураня, дзе мы бяром? На Захадзе...

Паспяховыя задзелы ў гэтай сферы мае тая ж Салігорская птушкафабрыка. Яшчэ адзін архіважны кірунак — насенне айчыннай селекцыі і максімальная адмова ад замежных аналагаў. Рэсурсаў вучоным і аграрыям выдзелена дастаткова. Імпарт насення толькі за ўласныя грошы сельгаспрадпрыемстваў. Ёсць грошы? Купляй што хочаш. Можаш імпартнае насенне, яшчэ штосьці купляць. Але ніякай дзяржаўнай падтрымкі на мэты закупак за межамі краіны не будзе.

Далей.

**Час кардынальна асучасніць галіну, пераходзіць на прынцыпы, як у нас модна казаць, лічбавай сельскай гаспадаркі з маштабаваннем тэхналогіі дакладнага земляробства. Таму мінімум 40 % арганізацый галіны да канца пяцігодкі неабходна асвоіць і ўкараніць дадзеную платформу ў сваіх гаспадарках.**

А вось што трэба зрабіць у кожнай сельгасарганізацыі, дык гэта цэнтралізаванае матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне і дыспетчарызацыю ўсёй работы з кантролем усіх працэсаў ад поля да фермы. Мы элементарнае не робім, мы не можам паставіць на планёрцы ў нейкім сельгаспрадпрыемстве, асабліва ў разгільдзяйскіх сельгаспрадпрыемствах, не можам паставіць задачу механізатарам, а потым у канцы дня патрабаваць за гэта. Мы ад усяго ад гэтага адышлі. Рынак? Гуляй, не хачу.

У выніку мы павінны мець выгаду ад харчовага экспарту са штогадовай мінімальнай планкай у 12 мільярдаў долараў.

**Шостае. Ашчаднасць і якасць.**

Гэта аксіёма канкурэнтаздольнасці беларускага тавару. Інструменты, якія шырока выкарыстоўваюцца ў свеце, так званы ашчадны менеджмент, у нас пакуль вельмі фрагментарнае ўкараненне.

**Разгарніце работу ў рамках адроджанага на дзяржаўным узроўні Знака якасці, які стаў нашай самай прэстыжнай узнагародай для вытворцаў. Толькі якасць і бездакорны сэрвіс забяспечыць нам выжыванне і дадатковы заробак.**

Мы не можам і надалей прадаваць нашу прадукцыю за мяжу, не забяспечыўшы яе сэрвісам. Ну а пра якасць я казаць не хачу. Няхай на працэнт-два прадукцыя будзе даражэйшая. МАЗы, БЕЛАЗы, МТЗ... Але гэта павінен быць якасны прадукт. Вы бачыце, якая канкурэнцыя ідзе. У СМІ штораз: то там загарэўся аўтобус МАЗ, то яшчэ недзе яго падпалілі. Пачынаем разбірацца — а нічога не гарэла. Гэта канкурэнцыя. Нас проста такім чынам спрабуюць нахіліць і паказаць, што ў нас няякасная прадукцыя. Але ёсць пытанні да нашай якасці. Трэба, каб іх не было.

**Сёмае. Эфектыўныя продажы для паспяховага знешняга гандлю.**

Нельга спадзявацца на авось ці на выпадковыя абставіны. Патрэбна прадуманая стратэгія, дакладны план з граматнай лагістыкай.

Вярнуўшыся з традыцыйных зімовых камандзіровак, у які раз пераконваюся: мы наогул не ўмеем гандляваць. Вы ведаеце, мне сорамна было весці з султанам Амана перагаворы і прасіць яго: «Дапамажыце, навучыце нас гандляваць. Мы вырабім, мы паставім, але давайце створым разам кампанію і будзем разам гандляваць на вашых традыцыйных рынках». Гэта што, нармальна? Вырабілі, за агароджу выкінулі, усё роўна, па якіх цэнах прадалі. Сядзім, нечага чакаем. **Быццам бы выпускаем годную лінейку тавараў, але пра іх ці не ведаюць на далёкіх рынках, ці нажываюцца натоўпы пасрэднікаў, здымаючы асноўныя вяршкі і атрымліваючы прыбытак. Час засвоіць, што продажы — гэта мастацтва.**

Праінфармую вас, што я даручыў нашаму намесніку старшыні, Косінцу Аляксандру Мікалаевічу, неадкладна заняцца гэтым пытаннем — пасрэдніцтвам. Выкарчаваць яго на пні. Мы губляем ад 30 да 50 % у цане толькі з-за таго, што кормім пасрэднікаў. Гэта нармальна? Пакуль рабочая група даложыць мне і ўнясе прапанову, міністры, неадкладна гэтым займіцеся. Я прыводзіў неадпойны прыклад, калі трэба было прытармазіць рост рапсу. Пасеялі яго, вы бачыце, якое надвор'е, азімыя растуць, растуць, перарастаюць. Значыць, не перазімуюць, асабліва рапс. Міністру кажу, завязі цэнтралізавана рэгулятары росту. Па імпарце мы іх купляем. Дык ён месяцы два ўзгадняў нейкае рашэнне дадаткова, калі гэты рапс ужо вырас па калена. Гэта што, нармальная сітуацыя? Нельга спадзявацца на авось ці выпадковыя абставіны, патрэбна прадуманая стратэгія, дакладны план з граматнай лагістыкай.

**Чыноўнік, які камандзіруецца за мяжу, павінен разумець: больш ніякага турызму. Саўмін, МЗС увядуць базу эканамічных інвестыцыйных заданняў па кожнай краіне.** Ураду за першае паўгоддзе 26-га года даручаю поўнасцю перагледзець ролю і функцыянал так званых інстытутаў развіцця. Навошта мы трацім столькі грошай на структуры, якіх не відаць і не чуваць? Нацыянальнае агенцтва па інвестыцыях пры Мінэканомікі, так? Нацыянальны цэнтр маркетынгу і кан'юнктуры цэн пры МЗС, Агенцтва па знешнеэканамічнай дзейнасці пры Банку развіцця, Беларуская гандлёва-прамысловая палата і іншае.





# ЧАС КАНКРЭТНЫХ

Вы ведаеце, вось я гляджу, Нацыянальны цэнтр маркетынгу і кан'юнктуры пры МЗС. Які маркетынг? Якая кан'юнктура? Так, такія пытанні ёсць. Дык гэта МЗС у цэлым павінна гэтым займацца. Якія яшчэ дадатковыя структуры? Гэта блатныя кармушкі чыноўнікаў з разадзьмутымі штатамі і заробкамі. Ліквідаваць на працягу першага квартала 26-га года.

Што датычыцца вытворцаў, дзяржава са свайго боку заўсёды гатова падставіць плячо экспарцёрам. Аддача відавочная, бюджэтныя інвестыцыі ў экспарт поўнасцю акупіліся. Дзясяткі разоў на кожны рубель бюджэтнай падтрымкі атрымалі 30 долараў экспарту. Калі трэба яшчэ нейкія стымулы, якія гарантавана дадуць вынік, прапануйце аператыўна.

**Восьмае. Дасканалы спажывецкі рынак.**

Для нас, беларусаў, выбар, які тавар купіць — беларускі ці замежны — гэта пытанне нацыянальнай бяспекі павінна быць. Многія ніяк не могуць пераадолець стэрэатып аб элітнасці імпарту. Але гэта не вынік досведу. Гэта інструмент прамывання мазгоў, калі хочаце, які быў дастаткова паспяхова прыменены яшчэ ў савецкім грамадстве асабліва на познім этапе развіцця.

> **Мы ж разумеем, што і тады, і сёння якасць тавараў, што вырабляюцца беларусамі, была і застаецца адной з найлепшых у свеце.**

Але ці так мы пазіцыянуем сябе на сваім жа рынку? Ну, ведаеце, можа, дзесьці там «Дольчэ Габана» ці яшчэ «Версачэ» і іншае. Можа, раскручана больш. Можа, нават якасна. Ну што, нельга насіць беларускае? Распрануць на вуліцы? Брыдка глядзець?

*(Апладысменты.)*

Я прыгадваю свае першыя камандзіроўкі на Захад. Амаль 30 гадоў таму. Ведаеце, ну неяк прытрымліваючыся моды, трэба было прыгожа апрануцца, яшчэ штосьці. І вось я сяджу на перагаворах з мільярдэрамі. Гэта была мая камандзіроўка ў Злучаныя Штаты Амерыкі. Мільярдэрамі. Думаю, Госпадзі, што гэта за людзі такія зачуханыя? Мільярдэры. Я вам шчыра кажу, паглядзеў: прасценькія касцюмчыкі і іншае. А ў іх сорамна было апранацца з іголачкі і шыкаваць. Сорамна. А мы, быццам бы, ведаеце, жывём у небагатай краіне, яшчэ штосьці, мы пра Беларусь кажам, вы кажаце. І наша насельніцтва. Але паглядзець — на якіх аўтамабілях ездзіць народ, апранаецца ў што. Паўстае пытанне: ну навошта вы траціце вялізныя грошы на тое, каб падтрымаць замежнага таваравытворцу? Ну, падтрымайце вы сваіх. «Камволь», аршанскі лён і гэтак далей. Добрыя тканіны, свае тканіны, бяспечныя экалагічна. Ну навошта вы гэта робіце? Гэта датычыцца кожнага. Над гэтым трэба падумаць, перш чым папракаць уладу ва ўсіх грахах, і мяне ў тым ліку.

**У большай ступені я звяртаюся да ўласнікаў гандлёвага бізнесу. Вы першыя фарміруеце попыт і вырашаеце, што і як пакласці на прылавак. Я не ведаю, ці павінен Прэзідэнт тлумачыць, што, калі на тавары напісана «Зроблена ў Беларусі», то перавага на паліцы павінна быць за ім. І мяне просяць аб гэтым неабыякавыя грамадзяне. Даўно просяць. Раблю апошнюю заўвагу.** І гандаль, хацеў сказаць таргашы, не буду вас крыўдзіць, вы потым на мяне не крыўдуйце. Унутры краіны гаспадарыць імпарт, а вы ходзіце па дзяржпадтрымку. Трэба перавярнуць гэту піраміду. Для ўрада паказчык долі айчынных тавараў на ўнутраным рынку будзе побач з цэнамі асноўны крытэрый у ацэнцы работы. Ёсць продажы — будуць аб'ёмы вытворчасці. ВУП будзе і экспарт. Але калі не будзе продажаў, не будзе ў вас ні ВУП, ні аб'ёмаў, ні заробкаў. Як эканаміст вам кажу, найпрацейшая формула. Усё павінна ісці ад збыту. Усе свае маркетплэйсы, гандлёвыя сеткі, іншыя структуры прымусьце, нарэшце, працаваць на краіну, інакш будзем разбірацца з гэтым іншымі вядомымі для вас метадамі. Іншага выйсця няма. Калі хочам жыць у нармальнай краіне, а не ваяваць.

**Дзявятае. Турызм — пункт прыросту эканомікі.**

Гэта стала актуальным у апошнія гады асабліва. Актуальнасць стварэння моцнага брэнда беларускага турызму, думаю, тлумачыць не трэба. Як і тое, што гэта сфера можа стаць наймагутнейшым інструментам прасоўвання іміджу Беларусі як адкрытай, гасціннай краіны. **Задача на наступнае пяцігоддзе — павялічыць уклад турызму ў эканоміку мінімум у два разы. Усё для гэтага ёсць.** Мінск — унікальная сталіца сусветнага ўзроўню. Брэстчына — гэта не толькі легендарная крэпасць-герой і старажытная Белавежская пушча, але і душа беларускага Палесся. Віцебск — культурны фестывальны цэнтр краіны, прыгажун. Гомельская вобласць прываблівае турыстаў палацава-паркавымі ансамблямі і самабытнай народнай культурай. Магілёўская зямля — гэта гаючыя крыніцы, унікальныя краязнаўчыя музеі. Гродзеншчына — край замкавай архітэктуры.

Кожны куток нашай краіны мае сваё аблічча і сваю самабытнасць. Нараканні турыстаў зводзяцца ў асноўным да адсутнасці сэрвісу па ўсім ланцужку паслуг і суправаджэння ў лічбавым выглядзе, браніравання жылля, куплі білетаў, пошуку маршрутаў, заказу экскурсій. Адсутнасць падобнага камфорту — гэта страта патэнцыяльнага госця. Усе рашэнні ў галіне па прапановах урада прыняты. **Прыступайце да распрацоўкі паўнавартаснай айчыннай турыстычнай платформы. Ва ўмовах ажыятажнага попыту ўжо ўчора трэба было пашыраць нумарны фонд санаторыяў, будаваць новыя атэлі, асабліва ў раённых цэнтрах.** Губернатары на гэта глядзяць збоку і чагосьці чакаюць. Не можаце самі — прыцягвайце да работы прыватныя структуры. Вам трэба больш актыўна прасоўваць турыстычныя паслугі праз нашы пасольствы, дылерскія цэнтры і нават больш агрэсіўную рэкламу. Нагрузіце гэтай работай паслоў, яны пакуль асабліва не перапрацоўваюць.

І яшчэ Беларусь — чыстая краіна. Гэта першае ўражанне, якое агучваюць нашы госці. Гэта вялізная праца. Дзясяткі тысяч людзей штодня выходзяць на працу, наводзяць прыгажосць, нават тады, калі большасць нашых грамадзян яшчэ спяць. Гаворка не толькі пра адсутнасць смецця, але і пра дагледжаныя паркі, упрыгожаныя кветкамі вуліцы і кожны добраўпарадкаваны для адпачынку куток. Мы настолькі прывыклі да такога парадку, што пачынаем злоўжываць гэтым, ствараючы звалкі адходаў нават у лясных масівах. Што вы робіце? Гэта ж ваша, вы ж туды дзяцей паведзяце адпачыць. У Год добраўпарадкавання ў нас дзясяткі выпадкаў псавання вандаламі новых аб'ектаў.

Можа, гэта не да месца, але, родныя беларусы, я звяртаюся да кожнага з вас. Давайце паважаць працу людзей, не прымушаць дзяржаву звяртацца да сінгапурскіх метадаў і не знішчаць краіну, бо адбудзецца тое, што ў гэтым «райскім заходнім садзе». Што датычыцца Сінгапура, нагадаю, там толькі за кінуты фанцік можна атрымаць штраф у 2000 рублёў ці папраўчыя работы. У нас такія ініцыятывы ўжо гучаць ад дэпутатаў. Ну няўжо яшчэ тут трэба прымаць драконаўскія метады?

**Дзясятае. Моцныя рэгіёны — гэта галоўны прыярытэт.**

Усе кірункі эканомікі, аб якіх гаварыў вышэй, павінны быць пакладзены ў аснову новай рэгіянальнай палітыкі. У кожнай вобласці і раёне туды ссоўваем цэнтр цяжару, усе сілы і рэсурсы. Найважнейшая задача — спыніць адток людзей з рэгіёнаў, разгрузіць сталіцу, абласныя цэнтры. Трэба вырашыць гэта пытанне рэвалюцыйнымі метадамі, канчаткова і без абмеркаванняў, бо абязлюдзім краіну. Сцягнем усё ў Мінск і абласныя цэнтры.

Ведаеце, я ўважліва сачу за сродкамі масавай інфармацыі, і мне запомнілася заява адной дзяўчыны ад імя моладзі: «Вось для нас цяпер галоўны прыярытэт — гэта жыллё». Правільна сказана. Але толькі гэта мілая, прыгожая дзяўчына павінна разумець, што для мяне як Прэзідэнта, на што я нацэльваю ўладу, галоўны прыярытэт — раўнамернае размеркаванне прадукцыйнай сілы. І калі жыллё — гэта і аграгарадок, апорная вёсачка, гэта раёны, абласныя цэнтры, а не толькі Мінск. Як можа быць, многія з моладзі гэта разумеюць. Таму калі вы паступаеце мэтавікамі ці яшчэ неяк у нейкую ВНУ медыцынскую, сельскагаспадарчую, вы перш, чым туды хадзіць, падумайце, што вам давядзецца працаваць, пачынаючы ад раённай бальніцы, можа, участковым, можа, недзе трэба падключыцца і паварушыць ФАП. Да гэтага трэба быць гатовым, а не проста я скончыў медыцынскую ВНУ, я хачу працаваць у Мінску, калі не, то я паеду заўтра туды. Ну, некаторыя з'ездзілі. Сёння ў Шведа (А. І. Швед, Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь. — **Заўв. рэд.**) чарга ў гэту самую камісію, каб вярнуцца назад. Думайце, думайце, асабліва моладзь, перш чым зрабіць нейкі крок, трэба думаць, як гэта было калісьці.

У Мінску павінен быць устаноўлены ліміт на ўвод новых метраў жылля. Не больш за трыста тысяч за год, можа, і менш.

> **Альтэрнатывы — гэта гарады-спадарожнікі. Стварайце там, на прылеглых да іх тэрыторыях, аналагічнае па якасці паўнавартаснае гарадское асяроддзе.**





# СПРАЎ

Хоць бачу, што тут мора праблем. Таксама комплексна разгледзім тэму ў наступным годзе. Гучаць ідэі замест гарадоў-спадарожнікаў развіваць вёскі-спадарожнікі — буйныя населеныя пункты для больш раўнамернага размеркавання насельніцтва. Каля двухсот вёсак такіх вызначана.

Нагадаю вам словы вядомага Васіля Шукшына з інтэрв'ю пасля выхаду фільма «Каліна чырвоная». Вы памятаеце, амаль 150 мільёнаў чалавек паглядзелі гэты фільм. Ён сказаў: са знішчэннем вёскі мы страцім і маральнасць, і духоўнасць, пазбавімся самабытнасці. Гэта нашы карані, асаблівы ўклад, праца, якая выхоўвае. Без сваёй зямлі чалавек, як былінка, уразлівы да ўсіх вятроў.

Гэта для мяне асноўнае пытанне. Таму я, часта нават мне няёмка, апраўдваюся, боўтаюся з раніцы да вечара па вёсках, па сельскагаспадарчых прадпрыемствах. Пытанне не ў тым, каб, як я ўжо казаў шчыра, Віцебская вобласць выйшла на нейкія паказчыкі. Даруйце, скажу яшчэ раз: ды мы без вытворчасці Віцебскай вобласці, нават Магілёўскай і Гомельскай, дзе больш за ўсё праблем, папросту сёння можам абысціся. І народ накормім, і яшчэ на экспарт хопіць. Мая задача выратаваць вёску, каб гэта не былі пустыя хаты, якія пакасіліся. Каб там жылі людзі, дзе толькі магчыма. І я хачу вось пад словамі Васіля Шукшына падпісацца. Адна з маіх задач, як я сказаў, выратаваць вёску. У гэтым уся сутнасць. Мы ж усе з вамі з вёскі. Ну азірніцеся, можа ў трэцім, чацвёртым пакаленні вашы бацькі жылі ў вёсцы. Я гэта кажу не таму, што я сам вясковы чалавек, не. А таму што вёска — аснова, аснова асноў нашага жыцця. Не будзе вёскі — загінем, дзяржава існаваць без гэтага не можа. Мы вернемся ў тыя часы. *(Апладысменты.)*

Перад вачыма Афрыка. Яны перажываюць цяжкія часы. Найбагацейшы рэгіён, вы нават уявіць сабе не можаце. У іх усё ёсць — ад золата, алмазаў да рэдказямельных металаў. У іх ёсць усё. Таму за Афрыкай, я кажу, будучыня. Але я ўспамінаю, першы раз сутыкнуўся ў Зімбабве — найбагацейшая краіна. Я кажу, у іх і газ прыродны, і нафта. Ну чаго там толькі няма. Бедныя. Галоўнае пытанне, пытаюся ў Прэзідэнта, у мяне добрыя з імі адносіны, асабістыя. Якое пытанне? Яны кажуць, дапамажыце нам забяспечыць харчовую бяспеку. Прасцей кажучы, дапамажыце накарміць народ. Мы на прыкладзе Зімбабве гэта паказалі за два гады. За два гады, як гаворыць Прэзідэнт Мнангагва, забяспечылі харчовую бяспеку краіны, якая ў тры разы па насельніцтве большая за нас. І па ўсёй Афрыцы пайшоў шум: беларусы могуць, беларусы дапамогуць.

**Мы туды пойдзем не як неакаланіялісты, мы ідзём туды як сябры. Як яны нас называюць, братамі. Мы іх навучаем, мы ім перадаём тэхналогіі, мы будуем у іх прадпрыемствы, якія ім патрэбны.** Вось без аўтатранспарту, без трактара там немагчыма жыць. Ну як без трактара ўвогуле сёння жыць? Трактар і вуліцы прыбірае, і транспартны сродак, і арэ. І мы ім дапамагаем. І яны адгукнуліся, адгукнуліся, што мы да іх ідзём з распасцёртымі рукамі, мы іх навучаем, мы робім для іх усё. Але ж гэта не бясплатна. Гэта не бясплатна. Вось гэта сведчанне таго, што дзяржава будзе плаціць апошнія грошы, але каб вырашыць задачу накарміць уласны народ.

Вось мы хочам вярнуцца ў тыя часы? Гэта, ведаеце, хутка адбудзецца. Вы нават не паспееце азірнуцца. Таму трэба напружыцца і трымаць той узровень, які мы дасягнулі, ну хоць крышку дадаючы, па 3-4 % кожны год валавога ўнутранага прадукту. 2 %, 2,5 — больш не трэба. З іншага боку, калі казаць аб сяле, аб вёсцы, я жыву і выдатна бачу, што зусім малыя вёскі, як іх раней звалі — неперспектыўныя, вядома, не маюць перспектывы свайго развіцця. Ведаеце, можа, і не трэба. З той тэхнікай, якая сёння прыйшла ў сельскую гаспадарку, мы ўзбуйняем, узбуйняем і ўзбуйняем сельскагаспадарчыя прадпрыемствы.

У нас вось паказчык «Дзяржынка», як мы яе называем, — 130 тысяч гектараў зямлі. Не кожны раён у краіне мае столькі зямлі. 130 тысяч. Адно з найлепшых, эфектыўна працуе.

Гэта сусветная тэндэнцыя. У нас ужо менш за 2 мільёны беларусаў жывуць у сельскай мясцовасці – 21 %. Мы на 10 % зменшылі насельніцтва ў вёсцы да моманту распаду Савецкага Саюза. Таксама сусветная тэндэнцыя. Таму я і кажу: нам патрэбен робат для даення кароў. Нам патрэбен прэс для таго, каб своечасова ўбраць сена, салому, бо людзей становіцца ўсё менш і менш. І наша моладзь сёння не гаворыць аб тым, калі трэба абжыллі, што трэба пайсці падаіць карову. Значыць, будуць працаваць робаты. Яны ёсць, але нам трэба свой, айчынны, калі мы хочам і далей звацца аграпрамысловай дзяржавай.

**Трэба замацаваць людзей у аграгарадках, у буйных, як я сказаў, апорных вёсках. Даць тут нармальнае жыццё.**

Так, усё гэта патрабуе ў большасці выпадкаў значных фінансавых, часавых затрат. Таму ўсе праграмныя дакументы, рэспубліканскія, рэгіянальныя павінны быць сінхранізаваны, або будзем мець справу з вялізным дысбалансам развіцця. На першым месцы працаўладкаванне і жыллё. Павінна быць жыллё і работа.

Мы не краіна Захаду, дзе людзі прывыклі падоўгу жыць у здымным жыллі, часам усё жыццё. Беларусы аддаюць перавагу жыць ва ўласных дамах і кватэрах. І гэта добра. Таму маладыя спецыялісты ў перспектыве павінны мець права выкупу арэнднага жылля, а яго будаўніцтва павінна быць увязана са стварэннем працоўных месцаў. Патрэбны новы нацыянальны падыход, які матывуе да пераезду ў сельскую мясцовасць з канкрэтнымі ўмовамі. Я не буду казаць аб тым, што трэба ў гэтым плане зрабіць. Думаю, ўрад гэтым зоймецца і далажыць. Але ўрад разам з нашымі дэпутатамі неабходна ў найбліжэйшы час унесці свае прапрацаваныя прапановы. І калі мы гаворым аб замацаванні ў рэгіёнах маладых спецыялістаў, то павінны ўдзяляць увагу сямейным парам з дзецьмі.

І яшчэ. Летась мы актыўна займаліся добраўпарадкаваннем тэрыторый, навялі парадак на многіх значных аб'ектах. Правялі два рэспубліканскія суботнікі. Цяпер трэба звярнуць увагу на закінутыя будынкі. Ўраду, выканкаму сумесна з ваеннымі. Неабходна максімальна спрасціць усе патрабаванні і працэдуры, паменшыць тэрміны і сам кошт зносу, уцягнуць у абарот зямлі, што з'явіліся. Усе паўнамоцтвы аддадзены, раздадзены, дакументы падпісаны. Трэба цэнтр цяжару перанесці на месцы. Старшыня райвыканкама, выканкамы павінны ў раёнах вырашаць гэту праблему, а можа і сельскія Саветы. Гэта іх інтарэс і зона адказнасці.

**Год добраўпарадкавання завяршаецца, але сам працэс не. Ён застаецца на кантролі ў Прэзідэнта.**

Няважна, якімі мэтамі і задачамі выклікана мае паездкі ў той ці іншы рэгіён. Першае, што я ацэньваю, — гаспадарскі падыход на любых аб'ектах. Не павінна быць зачуханых вытворчасцяў, вёсак, дарог і іншых. Не павінна быць. Не забывайце, што Беларусь — наш агульны дом. Парадак у ім — гэта першае, што трэба ўлічваць, гаворачы аб базавых установках развіцця сацыяльнай сферы. Камфорт — гэта якасць жыцця, а эканоміка — гэта людзі. Людзі, якія зноўку пабудавалі нашу краіну. Зусім нядаўна, пасля вайны. Мэты, якія мы вызначаем як галоўныя — гэта заўсёды адказы на два простыя пытанні: чаго мы чакаем ад дзяржавы і што гатовы і павінны зрабіць, каб дзяржава захавала звыклы і камфортны для нас сацыяльна арыентаваны план. Адказы на пастаўленыя мной пытанні і ёсць стратэгія краіны, накіраваная ў будучыню.

**Гэту дарогу зможа асіліць толькі здаровы чалавек. Павелічэнне працягласці жыцця мы вызначаем як адну са стратэгічных мэт.**

Укладваем вялізныя рэсурсы ў развіццё аховы здароўя. Пастаянна адкрываем новыя аб'екты, не шкадуем грошай на рамонт медыцынскіх устаноў, закупку сучаснага медабсталявання. У міжраённых цэнтрах праводзім аперацыі, якія раней выконваліся толькі ў РНПЦ — гэта я памятаю, гэта ўсё было на маіх вачах, — ці ў абласных бальніцах. У глыбінку прыязджаюць сучасныя перасоўныя фельчарска-акушэрскія пункты. Прычым многія з іх айчыннай вытворчасці. Умеем і можам усё, але не заўсёды ўсё робім. Умовы для работы створаны. Зарплату ўрачам паднялі, як яны патрабавалі, але трапіць да патрэбнага спецыяліста часта праблема. Асабліва ў малых раёнах і ў вёсцы. У гэтых «цік-токах» таксама чытаю. Хлеб у вяскоўцаў патрабуем, у сялян, а яны тыднямі чакаюць то кансультацыі спецыяліста, то дыягнастычных даследаванняў.

У нас чатыры медыцынскія ВНУ — дастатковая колькасць выпускнікоў для такой кампактнай краіны, як наша, а кадраў усё роўна не хапае. Ці хапае? У Беларусі ў нас урачоў што там на тысячу ці на дзесяць тысяч чалавек — у паўтара раза больш, чым у Еўрасаюзе. Дакладна не памятаю гэту лічбу.






# ЧАС КАНКРЭТНЫХ

Што яшчэ трэба? Праблему спрабуем вырашыць за кошт інтэрнаў, маладых спецыялістаў, але яны не затрымліваюцца. Чаму? Пытанне да ўсіх адказных: вы самі разумееце, што адбываецца ў нашай галіне? Разбярыцеся. Разам. Урад і кіраўнікі мясцовых органаў улады. У нас ёсць пастаянная рабочая група па медыцыне. І яшчэ раз звяртаю вашу ўвагу на тое, што ўсе этапы меддапамогі людзям — ад ранняга выяўлення хваробы, комплекснага лячэння да рэабілітацыі — павінны выконвацца ў аптымальныя тэрміны незалежна ад узросту і месца пражывання чалавека. Вось пасля гэтага хачу вам задаць пытанне. Нядаўна разумныя ў нас вышэйшыя службовыя асобы дасылаюць мне пісьмо. «Трэба ўсіх дыпламатычных, — прыкладна так, — работнікаў паставіць на ўлік, — ну, як мы называем, — прэзідэнцкай бальніцы». Сумленне ў вас ёсць? Чаго вы цягнецеся ў гэту бальніцу, яна ўжо даўно не самая лепшая ў краіне. У нас мора такіх бальніц. Я ж вам перадаў прэзідэнцкую гэту бальніцу, куды ўсе рваліся, у Мінск. Не, вось там. Ды Гасподзь з вамі, я там не лячуся. Не думайце, што вось там, дзе Прэзідэнт, там добра. Дзякуй Богу, яшчэ пакуль Гасподзь мяне збярог ад гэтай бальніцы. Я там не валяюся ў ёй, супакойцеся вы. І потым, а простым людзям як?

Пытанне якасці меддапамогі — тэма вельмі адчувальная і складаная. Складаная, як і праца ўрача. Разумею, што з людзьмі, якія самі ставяць сабе дыягназ, лечацца па інтэрнэце, запускаюць хваробу і чакаюць потым ад доктара цуду, з гэтымі людзьмі цяжка мець справу. Але і скаргі пацыентаў, з якімі часам даводзіцца разбірацца і Адміністрацыі Прэзідэнта, і іншым органам улады, часта маюць падставы. Такія звароты заўсёды будзем трымаць на кантролі. Гэта пытанне даверу грамадства да ўсёй сістэмы аховы здароўя, якая працуе ўсё ж годна. Што аценілі многія з тых, хто вярнуўся з Польшчы і Літвы, сербануўшы «райскага саду». Як я казаў, зубок палячыць — у Беларусь. Тут якасна і танней. Ну паехалі туды — няхай там вырываюць вам зубы і сківіцу. Чаго вы сюды вяртаецеся? Цішком трэба заехаць, у нас жа бязвіз.

Нам ёсць чым ганарыцца, і не трэба ўсё гэта, што ў нас ёсць, утоптваць у бруд. **Беларускія хірургі выконваюць высокатэхналагічныя аперацыі ў кардыялогіі, нейрахірургіі, траўматалогіі і транспланталогіі. Мы прыкладаем максімум намаганняў у барацьбе за жыццё дзяцей з самымі цяжкімі прагнозамі. У дзіцячай анкалогіі ўкаранілі і ўдасканальваем інавацыйныя тэхналогіі. Трымаем руку на пульсе ў развіцці рэпрадуктыўнай медыцыны. Толькі за апошнія тры гады нашы ўрачы правялі больш за пяць тысяч ЭКА. Нарадзіліся амаль дзве тысячы доўгачаканых малых.** Вось мужыкі дастукаліся, га?

Сітуацыю вы ведаеце. Сёння ўсе развітыя краіны сутыкнуліся з беспрэцэдэнтным зніжэннем нараджальнасці і старэннем насельніцтва. На жаль, Беларусь не выключэнне. Тое, што па аказанні медыцынскай дапамогі маці і дзецям наша краіна захоўвае лідзіруючыя пазіцыі ў свеце і мы працяглы час утрымліваем нізкія пакзачыкі дзіцячай, мацярынскай смяротнасці, з'яўляецца вялізным дасягненнем. Мы першыя ў свеце ў гэтым плане! Але гэта ўжо мала.

*(Апладысменты.)*

Каб толькі захоўваць колькасць насельніцтва, у сем'ях павінны нараджацца па трое малых.

*(Апладысменты.)*

Дарагія жанчыны! Нарадзіце траіх малых і патрабуйце ад мяне што заўгодна.

*(Апладысменты.)*

У нас некаторыя ў прэзідыуме сядзяць — па адным.

*(Смех у зале.)*

Так, з пункту гледжання матэрыяльнага стымулявання зроблена дастаткова. **Да з'яўлення дзіцяці будучыя мамы забяспечаны бясплатным поўным медыцынскім суправаджэннем, плацім важкія дзіцячыя дапамогі, прадугледжаны сямейны капітал, трымаем на магчымым мінімуме тарыфы за дзіцячы садок, субсідзіруючы іх з бюджэту. Слухайце, ну наогул, ад дзіцячага ўзросту да таго, як скончаць ВНУ, — на дзяржаўным забеспячэнні.**

Што не так? Адукацыя. Гэта ж дзікія грошы. Мы выдаткоўваем вялізныя грошы, каб у школе атрымаў адукацыю, у ВНУ паступіў. Слухайце, я некалі паступаў у ВНУ, а потым атрымліваў другую адукацыю. Вечна, скончыўшы ВНУ, няпроста было паступіць на эканамічны факультэт. А сёння нічога не трэба. Каб даць роўныя магчымасці, я пайшоў на тое, каб па мэтавых накіраваннях накіроўвалі ў сельгасВНУ, ды і ўвогуле ВНУ. Што яшчэ трэба? Бяры галаву ў рукі — і наперад, ідзі вучыся. Але калі ты не вучышся, дык які ж ты спецыяліст? І якое ты маеш права, патрабаваць потым ад улады: і нам трэба тысячу долараў ці дзве тысячы? Мы не можам. Мы не Савецкі Саюз, які меў велізарную колькасць нафты і газу, і мы не Расія, дзе можна прадаць, атрымаць і падзяліць потым. Трэба зарабляць. Як мы кажам аб чалавечым капітале. А для таго каб зарабляць, трэба вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца, як казаў вялікі Уладзімір Ільіч. Але гэта старое як свет. Таму мы, перш чым ад кагосьці нешта патрабаваць, асабліва ад мяне, ад улады, — у люстэрка. Паглядзіце на сябе, трэба працаваць.

Так, я прашу жанчын, каб траіх, хоць бы траіх нараджалі, але не менш важныя ўмовы працы для жанчын, якія выйшлі з дэкрэтнага водпуску і стаўленне да іх. У нас жа гэта цэлая бяда для працадаўцы. Ах, пойдзе, народзіць, а потым што з ёю рабіць? Нічога не рабіць. Другога трэба, каб трэцяга нараджала. У цяперашняй дэмаграфічнай сітуацыі злачынна нават думаць аб тым, што маладыя мамы — галаўны боль для працадаўцы. Але не заўсёды прычына толькі ў эканамічных мерах. Часта паўтараю: грашыма нараджаць не прымусім. І досвед апошняга дзесяцігоддзя гэта пацвердзіў. Самае цяжкае — работа са стэрэатыпамі, якія навязваюцца праз інтэрнэт, фільмы, рэкламу. Трэба ўлічваць і тое, як уплывае на свядомасць моладзі ствараемы вобраз паспяховага дзелавога чалавека, не абцяжаранага сям'ёй. Мы не зламаем гэтыя сусветныя тэндэнцыі, не закрыемся ад іх. Мода на нетрадыцыйную сям'ю — тая ж тэма. І ўсё гэта выглядае як глабальны праект супраць чалавецтва. Але што перашкаджае стварыць свой нацыянальны стэрэатып? Мы ж праз гэта праходзілі ўжо. Беларускі. Трэба вярнуць вобраз жанчыны-маці на пастамент. Сёння яна можа быць і дзелавой, і паспяховай. Нават з трыма і больш дзецьмі. Прыклады ёсць і ў палітыцы, і ў спорце, і ў іншых сферах. Гэта пытанне будучыні — нашай і нашых нашчадкаў. Не можа быць Беларусі, не можа быць краіны Беларусі без беларусаў. Нам патрэбны людзі. Гэта галоўнае пытанне, і я пра гэта адкрыта гавару.

> **Не менш важны, чым нараджэнне дзяцей, арыенцір — актыўнае даўгалецце.**

У большай ступені гэта вынік таго ладу жыцця, які выбіраем. У канцы 30-га года кожны пяты беларус будзе, пры цяперашніх тэмпах, старэйшы за 65 гадоў. Рэцэпт доўгага і якаснага жыцця ведаюць усе. Гэта фізкультура і спорт. Хоць бы. Не буду падрабязна расказваць, як шмат зроблена для магчымасці весці актыўны лад жыцця. Пачынаючы з абсталяваных дваровых тэрыторый, веласіпедных дарожак і заканчваючы палацамі спорту па ўсёй краіне. Ніколі ў нас не было такіх магчымасцяў займацца любымі відамі спорту. Хто і як іх выкарыстоўвае, пытанне мне вось тут у адміністрацыі напісалі асабістае. Ды нічога не асабістае. Мы не шануем сваё здароўе, а потым трацім велізарныя грошы і плацім адпаведным катэгорыям урачоў для таго, каб выцягнуць вас, засланіць вас ад гэтай хваробы. Вы памятаеце гэту пандэмію? Калі вы не памятаеце, я добра гэта запомніў. Я часта прыводжу гэты прыклад, калі я прыходзіў у рэанімацыйнае аддзяленне разам з міністрам, заходзіў туды, там вось такія горы ляжалі. Жывот да століі, ніводнага худога чалавека не было. Лішняя вага — гэта катастрофа. Гэта я вам кажу. Ведаю, што гавару.

> **Другі, не менш важны, прыярытэт, які злучае інтарэсы дзяржавы і грамадства, — якасць адукацыі.**

Усё пачынаецца са школьнай лавы. Толькі ў 2025 годзе нашы школьнікі сталі абсалютнымі пераможцамі Міжнароднай геаграфічнай алімпіяды. На алімпіядзе па матэматыцы каманда Беларусі заняла 5-е месца са 110 краін, апярэдзіўшы ўсе еўрапейскія дзяржавы.

*(Апладысменты.)*

**Экспарт адукацыйных паслуг у нас дасягнуў 115 мільёнаў долараў. Але гэта далёка не мяжа. Толькі ў 2025 годзе ў нас вучацца 35 тысяч замежных студэнтаў. Геаграфія — 120 краін.** І дзе б я ні бываў, нават у буйных краінах, нават у Кітайскай Народнай Рэспубліцы, — адукацыя. А можаце вы ўзяць гэтых, а можаце гэтых, гэтых, гэтых? Ну так, некаторыя кажуць, вось гранты, ну вось што б за наш кошт. Толькі калі я сустракаю людзей, якія размаўляюць у Афрыцы, у Зімбабвэ, Алжыры, на нашай роднай мове, на рускай мове размаўляюць, я думаю, усё ж малайцы ў Савецкім Саюзе. Грантаў гэтых хапала, выгадавалі нармальных спецыялістаў. Сёння яны ўжо кіраўнікі дзяржаў. Таму гэта наш актыў у любой краіне. Добры актыў, які дапамагае нам потым прасоўваць нашу эканоміку ў гэтых






# СПРАЎ

краінах. Але самае важнае — даступнасць айчыннай адукацыі для беларусаў. І мы тут сусветныя лідары, па даступнасці. У найбліжэйшай перспектыве нам трэба засяродзіцца на павышэнні гнуткасці сістэмы прафесійнай адукацыі. Карэкціроўка навучальных стандартаў і планаў павінна праводзіцца ў сціслыя тэрміны. Пад патрэбы заказчыкаў і патрабаванні эканомікі. Трэба працягваць скарачаць тэрміны падрыхтоўкі спецыялістаў, але з улікам інтэнсіфікацыі навучання. Атрымаць вышэйшую адукацыю, сярэднюю спецыяльную — гэта не прагулка па жыцці, гэта сапраўдная праца. Пасля абеду студэнты мусяць працаваць у лабараторыях, установах, на прадпрыемствах. Тады і заказчыкі кадраў не скажуць, што моладзь не ведае рэальнай вытворчасці. І капейку нейкую студэнтам можна плаціць. Трэба толькі падумаць, як гэта правільна зрабіць. Але трэба разумець, у моладзі фарміруецца запыт на актуальныя веды. Гэта рэаліі, якім павінны адпавядаць айчынныя школы і ВНУ, асабліва сёння, калі высокія тэхналогіі так глыбока пранікаюць ва ўсе сферы нашага жыцця, дыктуючы новыя патрабаванні. Мы павінны ўлічваць, што сёння вядучыя сусветныя дзяржавы актыўна фарміруюць нацыянальныя стратэгіі ў галіне штучнага інтэлекту. Беларусь мае сваю навуковую школу з глыбокімі традыцыямі ў матэматыцы, інфармацыйных тэхналогіях. У нас ёсць даследчыкі, інжынеры, распрацоўшчыкі сусветнага ўзроўню.

**Менавіта кадры новай фармацыі — галоўны арыенцір для сістэмы адукацыі.** Трэба больш рыхтаваць нана- і біятэхнолагаў, архітэктараў, высакакласных канструктараў і іншае. Ужо з наступнага навучальнага года ў БДУ пачнецца падрыхтоўка спецыялістаў заўтрашняга дня па прыродазнаўчанавуковых кірунках. Гэты вопыт павінен быць маштабаваны па ўсёй краіне з улікам профілю нашых ВНУ. Разлічваю, што Нацыянальная акадэмія навук Беларусі не будзе ў баку ад гэтай работы. Разам з урадам вам даручана літаральна ў бліжэйшы месяц унесці канкрэтныя прапановы аб павышэнні ролі нашай акадэміі з улікам нашых размоў. Без спараджэння навуковага ўтрыманства і пустой траты рэсурсаў.

Гаворачы аб развіцці сферы прававога рэгулявання дзяржавы, зраблю акцэнт на панаццi справядлівасці, аб якой часта гаворым. І так, запыт у сучасным грамадстве на справядлівасць толькі расце. Але гэта дарога з двухбаковым рухам. Мы ўсе хочам жыць і працаваць пад абаронай закона. Справядлівы запыт? Так. Дзяржава як сістэма патрабуе выконваць гэты закон. Справядліва? Зразумела. І ў гэтым пытанні ўзаемнай адказнасці найважнейшую ролю адыгрывае ўзровень уцягнутасці грамадства ў працэс заканатворчасці. Канстытуцыя краіны тройчы ў нашай гісторыі праходзіла экспертызу калектыўным меркаваннем, змены ў Асноўны Закон прымаў народ. Абсалютнай большасцю галасоў. У Канстытуцыі вызначаны базавыя пастулаты дзяржаўнага развіцця і нашай ідэалогіі. А любая спроба разбурыць іх, унесці смуту ў жыццё людзей цягне крымінальную адказнасць.

Нашы законы нічым не адрозніваюцца ад любых іншых у свеце. Але некаторыя вырашылі «панюхаць» заходнюю дэмакратыю, паддаўшыся эмоцыям. Сёння раскаяліся, як я казаў, дадому хочуць вярнуцца.

> **У Канстытуцыі, яшчэ раз падкрэслю, замацавана палітычная воля большасці. Закон нас абараняе — мы яго выконваем. Простая і аб'ектыўная формула прававой дзяржавы, якой і з'яўляецца Беларусь. Так мы разумеем нашу беларускую мадэль дэмакратычнага развіцця.**

Абсалютна перакананы, што неабходна больш актыўна ўключаць насельніцтва ў абмеркаванне змяненняў у заканадаўстве. У нас ёсць магутны рэсурс — наш Нацыянальны сход. Хачу звярнуць увагу Палаты прадстаўнікоў, Савета Рэспублікі на два моманты. Першы. Вы працуеце на месцах, у тым ліку са зваротамі выбаршчыкаў, сустракаецеся з людзьмі, ведаеце пра настроі ў грамадстве. З аднаго боку, гэта магчымасць адсочваць, як працуюць законы на практыцы, з другога — далучаць людзей да абмеркавання новых праектаў. Чым больш пачуем меркаванняў, тым бліжэй будзем да аптымальнага выніку. Ды і увогуле, з людзьмі трэба працаваць, каб яны нас не папракалі, што закон дрэнны, закон не той. Хаця зразумела, закон ёсць закон. Не бывае дрэнных і добрых. Закон ёсць закон. Яго трэба выконваць. Але працаваць з людзьмі трэба. Мы ж славяне, мы прывыклі да таго, каб з намі размаўлялі, каб улада размаўляла са сваімі людзьмі. Слухайце, нашы людзі такія (я гэта памятаю з дэпутацкіх часоў) — нават калі ты не дапаможаш яму, але па-чалавечы пагаворыш, ён будзе табе ўдзячны. Не трэба забывацца на гэту простую ісціну.

Другі момант, гэта датычыцца кіраўнікоў парламента, — вамі створана мноства груп, камісій, экспертных саветаў. Вы ўвесь час збіраецеся і нешта абмяркоўваеце. Ну, напэўна, гэта правільна. Але часта пасля такіх парад раз за разам прыходзіце да Прэзідэнта з ініцыятывамі ўдакладніць пункт, абзац, артыкул і гэтак далей. Вось чаму я кажу пра сістэматызацыю заканадаўства. Я даручаў правесці рэвізію падзаконных актаў, ды і заканадаўства, законаў у цэлым. Праведзена маштабная работа, але яна не павінна быць разавай акцыяй. Рэвізію заканадаўства варта праводзіць на пастаяннай аснове, таму што жыццё, асабліва цяпер, вельмі хутка мяняецца. Законы адстаюць ад гэтага жыцця.

Некалькі слоў аб ролі Усебеларускага народнага сходу ў працэсе прававога рэгулявання. Вы, шаноўныя сябры, надзелены высокім статусам. А гэта давер народа, які вы прадстаўляеце. Як дэлегаты, вы ўпаўнаважаны прымаць найважнейшыя рашэнні — ад эканомікі і фарміравання вышэйшых судоў да пытанняў міру і бяспекі. Ужо на гэтым пасяджэнні вам трэба будзе прыняць кадравыя рашэнні, якія прадугледжваюць сур'ёзнае абнаўленне Канстытуцыйнага і Вярхоўнага судоў. Гэта не толькі амаладжэнне судзейскага корпуса.

> **УНС павінна забяспечваць непахіснасць, вы павінны забяспечваць непахіснасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадзянскую згоду. Калі хочаце, вы — школа. Вы — будучыня.**

Менавіта адсюль, з гэтай глыбіні, Аляксандр Мікалаевіч (Аляксандр Косінец, намеснік Старшыні Усебеларускага народнага сходу. — **Заўв. рэд.**), трэба чэрпаць будучыя кадры. Ён увесь час прыходзіць, кажа: «А што рабіць? А ці будзем кантраляваць? А будзем збірацъ? А будзем...» Спыніце ўсякія зборышчы! Кожны павінен насіць, як сцяг, гэта высокае званне члена народнага веча. Вы — будучыня нашай краіны.

*(Апладысменты.)*

Мы павінны ў вас бачыць будучых кіраўнікоў, будучых міністраў, старшыняў райвыканкамаў, губернатара. Таму што ўпэўнены, што амаль сто працэнтаў вас — гэта патрыёты нашай краіны, што вельмі сёння запатрабавана.

*(Апладысменты.)*

Вы, як гэта гаварылася ў вайну і пасля, павінны весці за сабой. Вы не маеце права, бо і я, я гэта адчуваю і разумею, вы не маеце права быць дрэннымі людзьмі. Вы не можаце адставаць у рабоце. Вы нідзе не павінны быць у хвасце. Вы не павінны там плесціся. Вы павінны быць наперадзе. Вось задача нашых УНСаўцаў. І потым, вы павінны разумець. Так, сёмы Усебеларускі народны сход, але ўспомніце першы. Тады вырашалася пытанне: быць ці не быць. Дзякуй богу, навучыў мяне звярнуцца да гэтага народнага веча. Я як гісторык разумеў, што трэба сабраць людзей, трэба ў іх атрымаць падтрымку. І пасля першага Усебеларускага народнага сходу на вуліцах машыны перакульвалі. Вы гэта бачыце з кадраў хронікі. Але сітуацыя абсалютна пачала мяняцца, па-мойму, з 96 года мінулага стагоддзя. Пачала мяняцца. Вось за гэта трэба схіляцца (хутка пройдзе час, ацэніце), схіляцца перад Усебеларускім народным сходам. Ён у цяжкую хвіліну сказаў: «Не. Мы гэтага сапліваға Прэзідэнта падтрымліваем, мы яго выбралі, і мы павінны ісці наперад, наперад і толькі наперад, не спыняючыся».

*(Апладысменты.)*

Вось для гэтага мы існуём. Ну і потым. Хоць мяне і крытыкуюць часта за гэта, калі я кажу, ну, я ж не вечны. Так, мы стварылі сістэму, шмат што вісіць на Прэзідэнце, дзякуй, што вы мяне падтрымліваеце. Не было б гэтай падтрымкі — шмат чаго б не было ў краіне. Усё ад вас.

*(Апладысменты.)*

Але я адыходзячы Прэзідэнт. Я вечна не магу быць Прэзідэнтам. Ды і не трэба. Але як Прэзідэнт, які нямала зрабіў для краіны, разам з вамі... Мяне не можа не турбаваць, што будзе потым.





# ЧАС КАНКРЭТНЫХ

Толькі вы — стабілізатар нашага грамадства. Ніякія прэзідэнты, ніякія партыі, групкі, ніякія дэпутаты ды іншыя не змогуць зламаць таго, што мы з вамі створым. Так, будзем мяняць. Вы будзеце мяняць. Але вы павінны накіраваць краіну, паставіць на рэйкі, падштурхнуць — і няхай ідзе наперад. Ніякіх зігзагаў недарэчных і ваганняў. Калі трэба абысці перашкоду нейкую рэзка, тут, на гэтай пляцоўцы вы будзеце вырашаць, што рабіць. Вось для чаго вы створаны. А не для таго, каб бегаць па краіне і нешта кантраляваць. Вы каго будзеце кантраляваць? Тут жа буйныя кіраўнікі, старшыні райвыканкамаў, губернатары, члены ўрада, дэпутаты. Вы што, самі сябе будзеце кантраляваць? Усё створана, устаканена, як належыць. Трэба ў гэтым напрамку дзейнічаць. А мы з вамі, гэта яшчэ адна задача, павінны знайсці сваё месца, канстытуцыйнае месца ў гэтым жыцці. Але зыходзіць трэба з вялікіх задач, якія мы з вамі будзем вырашаць. Ну, гэта так. Я бліжэйшым часам падумаю яшчэ раз над гэтымі пытаннямі. І, можа, да наступнага пасяджэння нашага Усебеларускага народнага сходу выкладу свой пункт гледжання больш канкрэтна па будучым Усебеларускім народным сходзе. Але вось гэта ўвогуле. Не трэба драбнатэмнасці, як навукоўцы кажуць. Не трэба кідацца на розныя дробязі. Не наша пытанне.

Мы створаны для вырашэння глабальных задач. Не дай бог, я часта кажу, навокал бачыце, я пра гэта зараз скажу, што адбываецца. А калі вайна? Ну так, можна сказаць: Прэзідэнт — Галоўнакамандуючы, ён прыме гэта рашэнне. Але, каб гэта рашэнне зыходзіла ад народа, мы з вамі павінны прыняць гэта рашэнне. Будзем хэндэхох, здавацца ці ж будзем абараняць сваю краіну. Слухайце, не трэба краіну. Не трэба краіну. Абараніце сваіх дзяцей. Абараніце сваю сям'ю. Мужыкі, абараніце сваю каханую жанчыну, у рэшце рэшт. Гэта і ёсць наша краіна і наша радзіма. Вось што сёння і заўтра трэба ад нас.

*(Апладысменты.)*

Аналагічныя мэты павінны ставіць перад сабой усе грамадскія арганізацыі і партыі. **Час такі. Абарона інтарэсаў у Беларусі — на першым месцы. Не будуць больш у нашым палітычным полі працаваць іншаагенты і экстрэмісты. Гэта таксама пытанне справядлівасці.** Таму, калі я кагосьці там адпусціў, ці то ў Літву, Польшчу ці на поўдзень, вы не хвалюйцеся. Гэта мае функцыі і паўнамоцтвы. Вы мяне выбралі, дазвольце мне выконваць свае паўнамоцтвы. А вы на кожным працоўным месцы, як я кажу, выконвайце свае, ціха, спакойна, мы вырашым усе пытанні. І з амерыканцамі, кітайцамі, расіянамі, і з афрыканцамі. Калі я ў нечым не мае рацыю — ну дык хутка выбары. У гэтым сутнасць дэмакратыі. Калі мы пачнём зараз адзін аднаго мучыць, хто правільна, хто няправільна зрабіў, дзесьці пачнём варушыць, мы такі хаос у грамадстве спародзім!

Я гэта спецыяльна кажу. Калі пачаліся перагаворы з амерыканцамі (можа, на гэту тэму пагаворым, мне даслалі пытанні, я потым больш падрабязна пра гэта скажу), калі мы пачалі гэты дыялог з амерыканцамі, некаторыя... Я нават Івану Кубракову сказаў: ты паглядзі на нашых хлопцаў, амапаўцаў ды іншых, якія ў першых шэрагах стаялі і абаранялі краіну. Яны кажуць: «Ну вось, навошта, вось яны такія-сякія, іх трэба «мачыць» там, не выпускаць з турмы». Ну, хлопцаў... Ну добра, пасядзяць яшчэ годва. У некаторых тэрміны заканчваюцца. Памятаеце, пасля чарговай партыі мяне ўсе папракалі адтуль: «А, Лука падмануў усіх, ён выпусціў тых, якія праз два месяцы павінны былі выйсці». Ну, вы мяне прасілі, — я выпусціў. Але яны ж маюць рацыю — два месяцы заставаліся.

*(Апладысменты.)*

Не прасіце. Таму вы не хвалюйцеся. Па-першае, фарміруюць розныя спісы і іншае, так, мне даводзіцца прымаць рашэнні. Я вам расказваў, гэтага адмарозка, жонка якога сядзіць у Літве з дзеткамі... І яна прасіла сям'ю ўз'яднаць. І яшчэ нешта нашы не хацелі: ды няхай сядзіць, такі-сякі, забойца, вашага сына хацеў там забіць і іншае. Ну хлопцы, ну чаго там казаць, што было ўчора? Гэта трэба памятаць, забывацца не трэба. Ну давайце адпусцім, ну просіць жонка ўз'яднацца. Аб'ядналі. Вы ж ведаеце, што адбываецца. Не трэба вам расказваць. Калі б гэта не на такім форуме, не ў адкрытым доступе, я б вам шмат чаго мог расказаць. Тое, што мы бачым і ведаем. Цяпер крычаць: «Зноў падмануў». Ну чаго я вас падмануў? Вы ж прасілі. Вы прасілі — бярыце. Цяпер не паспелі гэтых выпусціць — яны там ствараюць у Германіі асобны цэнтр, лахушкі-ціхушкі не патрэбныя. Рабяты, ну вы прасілі іх выпусціць. А грошай не хапае. А дзяліць трэба тое, што ёсць. І пайшло-паехала. Цяпер замоўклі, сказаць няма чаго. Я рабіў тое, што вы прасілі. Таму, рабяты, вы мяне не папракайце, калі я недзе нечага там зрабіў у сілу сваіх паўнамоцтваў.

Я свята памятаю, што нам сёння трэба. І спачатку вам сказаў: будзе эканоміка — будзе суверэнная і незалежная Беларусь.

*(Апладысменты)*

Шмат хто ўзрадаваўся: ах, з «Белавія» знялі санкцыі. Ну, мне амерыканцы так і падавалі: спадар Прэзідэнт, можа, з «Белавія» знімем санкцыі. Я: паважаныя спадары амерыканцы, не знімайце! У нас, калі раней самалёты два-тры стаялі на стаянцы ў аэрапорце, сёння ўсе лётаюць, і не хапае іх. Ну, мы вось з Пуціным дамовіліся, мы купім расійскія самалёты. Так, якія ўжо адпрацавалі, добрыя самалёты, і будзем перавозіць людзей. Сёння ў Расіі, у вялізнай Расіі паўсвету, у Кітаі, у Азіі і іншае, дзе мы лятаем, не хапае самалётаў. Што вы, мне нейкі падарунак зрабілі? Ну, знялі, добра, у нас парк «боінгаў» дастаткова, запчасткі будзем купляць, дзякуй вам. Тое ж самае па «Белкалію» зараз. Вось мы знімем з «Белкалію» санкцыі. З усяго. Я гавару: дзякуй, але нам гэта не актуальна. Не актуальна. Мы летась, сёлета, Аляксандр Генрыхавіч (Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын. — **Заўв. рэд.**) атрымаем, прарадзім больш калію, чым у былыя гады, і грошай нават атрымаем больш.

Вось і ўсё. Таму не думайце, што тут нам зрабілі, вай-вай-вай якія паслугі аказалі. І амерыканцам яшчэ на першай сустрэчы прапанавалі: хлопцы, вы ж бізнесовыя ўсе. Вы падумайце над тым. Мы будавалі прыватны руднік. Прыватнік сышоў, спалохаўся вашых санкцый. Вы падумайце. Ну, не мільярд, але тры. Тры мільярды. Набудзьце ў нас гэту новую фабрыку. Увесь калій вы па сусветных цэнах купляеце, забіраеце ў Амерыку, ну ў нагрузку яшчэ са старога рудніка мы вам дадзім пару-тройку мільёнаў тон нафты. Амерыка — гэта прэміяльны рынак.

Думаюць. Уваходзьце ў капітал гэтага прадпрыемства. Мы вас запрашаем. Можа, ваяваць супраць нас тады не будзеце і не будзеце планы выношваць. Думаюць. Таму я гляджу далей, чым проста нейкія там зняць санкцыі. Ды перажывём мы. Трамп не дурань. Вы не глядзіце, што ён такі эпатажны, што перад СМІ... Гэта такі чалавек. Ён не дурань. Асабіста ён не дурань. Ён недзе нахіліць, потым адступіць. Я ўжо яго палітыку ведаю, і амерыканцы гэта пацвердзілі. Яны ведаюць, што ім патрэбна. І ад Венесуэлы яны ведаюць, што мы абмяркоўвалі шмат гэту праблему, і ад Расіі, і ад Украіны. Перш за ўсё, рэдказямельныя металы па Украіне. Яны прапіхваюць не бізнес, яны эканоміку прапіхваюць сваю. Мір праз сілу. Амерыка перш за ўсё. Гэта іх лозунгі. Таму я шчыра кажу: «Хлопцы, я разумею, чаго вы хочаце. Але вы павінны разумець: мы значна меншыя, чым вы. Па эканоміцы нават не гавару. Але ў нас ёсць уласныя інтарэсы. І я як Прэзідэнт павінен выказваць гэтыя інтарэсы беларускага народа. Гэта аснова нашых перагавораў. Таму вы не парцеся, не перажывайце. Не час Прэзідэнта Лукашэнкі вам здраджваць. Або прадаваць, як тут нашы экстрэмісты, збеглыя там, ціхія лахушкі: «Прыйдзем да ўлады — прыватызуем». Яны ж не гавораць, што аддадзім, распрададзім. «Мы ўсё прыватызуем». Прададзім. У прыватную ўласнасць ператворым. А хто гэта купіць? Рытарычнае пытанне.

> **Нацыянальнае адзінства, мір, бяспека — гэта базавыя каштоўнасці, якія мы ўсведамляем з кожным днём усё вастрэй. І гэта вынік, у тым ліку, штодзённай працы сілавых ведамстваў, структур, кожнага супрацоўніка ў пагонах.**

Аб'ектыўна, лёгкай службы не бывае. Лёгкіх перыядаў у частцы рызыкі, пагроз нацыянальнай бяспецы таксама няма. Ды і не было ў нас ніколі ў гісторыі. А сёння яны ў разы большыя.

Гэта страшная тэндэнцыя. Сусветную супольнасць уцягваюць у глабальную вайну. Якія б мірныя ініцыятывы ні гучалі, сітуацыя сур'ёзна абвастраецца. Нават той жа Трамп, што б ён ні меркаваў, вы бачыце, як цягамоціну зладжваюць. Гэта ўсё душаць, душаць, раствараюць. Баяцца ў лоб. Хаця ўжо там-сям журналісты і іншыя кажуць, іх прапагандысты, як яны кажуць, рупар, яны пра гэта кажуць.

Але, тым не менш, так цішком, цішком: Валодзечка, ідзі ваюй, на Зяленскага, ідзі ваюй. Мы табе нешта дадзім. Тысячы паміраць — але гэта ж не нашы гінуць. Адзін з высокапастаўленых, байдэнаўскіх, праўда, чыноўнікаў у апошні год свайго існавання ў адміністрацыі сказаў: «Няхай, няхай ваююць. Няхай ваююць. Гэта ім за той тэрор,






# СПРАЎ

які былі разгорнуты супраць яўрэйскага насельніцтва».

Слухайце, нас папракаюць, што мы прыгняталі яўрэяў? Ды ў Беларусі, напрыклад, палова ўрада яўрэі. Дзе мы кагосьці гнабім? Нармальныя, разумныя людзі, палякі, яўрэі, украінцы, рускія, беларусы. Ідзіце працуйце. Але ведаеце, парадак вось. Трапілі не туды, не хадзіце. Памятаеце, я папракаў яўрэяў, калі мы аднаго памочніка Прэзідэнта туды адправілі? Пабеглі да мяне. Малайцы, абараняюць сваіх. Але мы не ў Ізраілі жывём. Жывём у Беларусі. У нас ёсць законы, за гэта будзеце адказваць.

*(Апладысменты.)*

І ніводзін яўрэй, ніводзін паляк у мой агарод камень не кіне. Ніколі не было такога, каб мы кагосьці там нахілялі і нечага прымушалі. Гэта нашы людзі, я як гісторык ведаю. Дзесьці Вадзім Гігін, тут... (В. Ф. Гігін — дэпутат Палаты прадстаўнікоў, генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі. — **Заўв. рэд.**) рыса аселасці, Вадзім, у нас была? Як гісторык. Куды ад гэтага падзенешся?..

Нядаўна выявіў, што ў бліжэйшым маім асяроддзі палова каталічак, жанчын, дзяўчынак працуе. Выдатныя работнікі і супрацоўнікі. Тое ж самае магу сказаць пра кіруючыя органы ўлады. Вось і ўся нацыянальная ідэя. Я не кажу пра рускіх, украінцаў і беларусаў. Вось яна, нацыянальная ідэя ў дзеянні. Не трэба гнабіць людзей. Калі вы іх паклікалі да сябе на працу, ці яны нейкім чынам тут аказаліся, яны павінны быць такімі, як наша тытульная, так бы мовіць, нацыя. І тады не будзе ніякіх успышак, не будзе ніякіх канфліктаў. Такой Беларусь будзе. І нават без мяне. Мы гэта павінны ўлічыць.

*(Апладысменты.)*

**Мы маем сёння ў Беларусі сістэму рэагавання праваахоўных органаў, якая эфектыўна функцыянуе, на любыя выклікі і пагрозы. Мы стварылі яе ў цяжкі перыяд, пераламалі небяспечную сітуацыю, якая склалася ў 90-я. Тады навесці парадак, забяспечыць людзям абарону ад бандыцкага самавольства стала справай гонару. Як гэта рабілася, я вам расказваў. Сёння кожны грамадзянін ведае, што яго жыццё, маёмасць знаходзяцца пад надзейнай абаронай.** У нас можна развіваць бізнес без «даху» ад браткоў. І тое, што мы ўсё гэта ўспрымаем як норму, вялікае дасягненне. Я не сказаў, што гэтага ў нас няма. У нас гэтага дабра хапае. Але вы ведаеце, мае, і не толькі мае, адпаведных людзей, сілавікоў, ведаеце да гэтага адносіны. Максімальна камфортныя ўмовы створаны ў Беларусі для інвестараў. Патрабаванне адно. І яно прынцыповае: плаціце годны заробак тым, хто ў вас працуе ў Беларусі, выконвайце законы і не змешвайце эканоміку з палітыкай. Хочаце быць прэзідэнтам? Калі ласка, 30-ы год. Але не трэба эксплуатаваць наш народ, грошы зарабляць, выводзіць у Літву, а потым адтуль фінансаваць пратэстны настрой. Вось гэтага не павінна быць. Усё павінна быць сумленна. Мяне ў гэтым не папракнуць. Не паспеў паехаць на Блізкі Усход, чытаю: грошы хавае. Я думаю, ну навошта вы беларусаў дурнямі трымаеце? Вось у нас тут Раман Галоўчанка, галоўны банкір. (Р. А. Галоўчанка — старшыня праўлення Нацыянальнага Банка Беларусі. — **Заўв. рэд.**).

Як, Раман, як можна схаваць сёння грошы? Ну як растлумачыць гэта? Грошы якія? Сядзім у вузкім коле. Летась пісалі — 13 мільярдаў долараў. Раман, а колькі ў нас бюджэт гадавы? Бюджэт рэспубліканскі? Менш. 13 скраў. Сёння напісалі — 9. Ну і ўсё так. Жартам маладняк кажа: недзе прэзідэнт за год прамматаў 4 мільярды долараў...

Чаму, я кажу, за дурняў беларусаў трымаюць? Як можна такія грошы схаваць? Я на гэта проста адказваю: «Рабята, ну вы ж, напэўна, ведаеце, дзе я там схаваў, кудысьці перавозіў. Ну і забярыце. Трэба пісьмовая даверанасць? Я вам дам. Ідзіце, забярыце. Ведаеце, вось круцяць, круцяць, верцяць. Як толькі ў нас нейкі крок, як у мінулы раз вызвалілі, зараз вызвалілі, яны шукаюць, як насельніцтва адвесці ад гэтай праблемы, дзе яны прайгралі. І не думайце. Нідзе вы больш не пераможаце. Мы зрабілі высновы з 20-га года. І мы вас будзем бамбіць, бамбіць у інфармацыйным асяроддзі, пакуль Эйсмант жывы. (І. М. Эйсмант, старшыня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі. — **Заўв. рэд.**).

*(Апладысменты.)*

Аб Узброеных Сілах. **Нашы Узброеныя Сілы зрабілі ўпор на айчынныя сістэмы. Якія самі вырабляем, і даволі няддрэнна.** У краіне створана беларуская школа ракетабудавання. Арганізавана вытворчасць уласнай стралковай зброі і боеприпасаў. Якія б беспілотнікі ні былі, салдат з кулямётам, аўтаматам, пісталетам, гранатамётам вырашае праблемы на полі бою, асабліва ў нашых умовах, калі вакол лес і балота. Гэта найважнейшая ўмова перамогі. Мы пачалі гэта рабіць.

Потым зрабілі СПА-шны «Бук», які сёння па ўсім свеце просяць. Дзе гэта міністр абароны? Зрабілі гэты «Бук», свая ракета, свае ўстаноўкі. Так? Выдатная машына, нам у Беларусі дастаткова. Навучыліся вырабляць дроны, але заўсёды ваенных супакойвалі. Не спяшайцеся, не спяшайцеся. Гэта не стэпавая краіна, дзе ўсё як на далоні, і яны дронамі, камікадзэ ці іншымі, наносяць табе шкоду. Мы жывём у лесе, і вайна будзе, падабаецца, не падабаецца, у асноўным партызанскай. Мы не будзем хадзіць па плошчах з кулямётам або з нейкай стрэльбай, каб знішчыць гэты дрон.

Трэба бачыць, дзе мы будзем весці вайну. Зыходзячы з гэтага і пачалі ствараць свае ўзбраенні. Яны значна таннейшыя.

Але мы не забываем і аб ракетах. Беспілотнікі, контрбатарэйная радыёэлектронная барацьба, аператыўная маскіроўка, гэта тое, на што неабходна звярнуць першачарговую ўвагу. Людзі ў пагонах гэта добра ведаюць.

Ім даводзіцца грунтоўна вывучаць вопыт сучасных ваенных канфліктаў, перш за ўсё на спецыяльнай ваеннай аперацыі. Мы ўключылі ў склад узброеных сіл новы род спецыяльных войск, беспілотную авіяцыю. Няхай будзе. Дроны — новая рэальнасць. **Але ніякія дроны не заменяць падрыхтаванага салдата. Трэба не забываць — фізічная падрыхтоўка і агнявая.** Нас яшчэ раз тыя вагнераўцы, якіх я выводзіў у Беларусь, да рэалій вярнулі. І сказалі, а фізічна? Ну, элементарна. Што за салдат, калі ён фізічна язык на плячо і не можа хадзіць, бегаць, не тое што ваяваць? Аказваецца, фізічная падрыхтоўка ў аснове ўсяго. Так было і ў мае часы. Агнявая падрыхтоўка.

Калі ў цябе ружжо, ты павінен умець страляць з яго. І не проста страляць, а трапляць. І потым пайшлі далей, дайшлі да таго, што трэба ствараць народнае апалчэнне для таго, каб кожны мог абараніць сваю сям'ю.

Ну як у Айчынную вайну казалі: «Хоць аднаго фашыста, але я заб'ю». Але гэта ж трэба ўмець, трэба навучыць. І калі мне прапанавалі толькі кадравыя войскі, трэба прыбраць гэты прызыў, як у нас, я сказаў: «Не, ні ў якім разе!» Кожны малады чалавек, пабываўшы ў войску, — гэта іншы чалавек, і ён хоць нечаму навучыцца. Ён сям'ю сваю зможа абараніць. А глядзіце, што адбываецца сёння. Германія, вялікая Германія хоча вярнуцца да набору ваенных па прызыву, як у нас. Так? Так. І ўсё ў НАТА, амерыканцы пра гэта задумваліся. Вось што значыць па-дурному прыняць рашэнне, а вярнуцца назад вельмі складана. Не думайце, што сёння ўсё ў нас вельмі хочуць служыць.

Нядаўна міністр абароны сказаў, не хапае людзей, трэба было нейкія льготы адмяніць. І мы паспрабавалі толькі казаць пра гэта, як вэрхал падняўся на ўсю краіну. Таму забегчы далёка, а потым вярнуцца, вельмі складана. Гэта як падняў заробак — потым не паменшыш, нават калі ў цябе эканамічныя паказчыкі горшыя. Ведаю гэта са сваёй працы кіраўніком прадпрыемстваў. Таму ўсё трэба рабіць спакойна, абдумана, step by step, крок за крокам рухацца наперад. Галоўнае, не спыняцца.

**Стратэгічную абарону забяспечвае і наша ваенная супрацоўніцтва, перш за ўсё з Расійскай Федэрацыяй. Таму Беларусь і Расія рэалізуюць комплекс мер стратэгічнага стрымлівання.** Гэта разгортванне на нашай тэрыторыі расійскім складнікам рэгіянальнай групоўкі войск. У выпадку абвастрэння канфлікту прапісаная ўзброеныя сілы: некалькі дзясяткаў тысяч чалавек на захадзе Расіі, якія неадкладна другім эшалонам уключаюцца ў ваенную барацьбу. Першым ідзе Беларусь. Нам трэба рэагаваць. Далей нас падтрымлівае Расійская Федэрацыя. Вось гэта і ёсць рэгіянальная групоўка войск і тактычнай ядзерны зброі, якую мы вярнулі ў Беларусь.

> **Акрамя таго, першыя пазіцыі абсталяваны для ракетнага комплексу «Арэшнік». Ён у нас з учарашняга дня і заступае на баявое дзяжурства.**

*(Апладысменты.)*

Пры гэтым хачу вас папярэдзіць. Ведаеце, многія пачалі крычаць: «Ах, Беларусь паставіў пад прыцэл, ах, ядзерная зброя. Яна ж будзе перш за ўсё атакавана замежнікамі. Або «Арэшнік». Страшную зброю прадэманстравала Расія на адным з найбуйнейшых заводаў. «Вось бяда, вось бяда, прывёз сюды». Не паддавайцеся гэтым размовам.






# ЧАС КАНКРЭТНЫХ

Паралель прывяду. Памятаеце, атамную станцыю пачалі будаваць? «Ды вы што? У чарнобыльскай рэспубліцы? Навошта нам гэтая атамная станцыя? Ды не трэба». Літва хоча сваю пабудаваць атамную станцыю. Польшча аж дзве. Германія, Францыя цалкам раскансервавалі атамныя электрастанцыі і прызналі, што гэта чыстая электрычная энергія. А Трамп здзекуецца з усёй Еўропы: «Ідыёты, дурні. Вы што робіце? Якая зялёная эканоміка?» Ну ўжо далей пайшло.

Таму не паддавайцеся гэтым размовам, што вось ядзерная зброя, па гэтых аб'ектах будуць нанесены ўдары. А што, калі супраць нас будуць ваяваць? Нас што — гладзіць па галоўцы будуць? Супраць нас будуць наносіць удары. І будуць наносіць удары, як модна казаць, па цэнтрах прыняцця рашэнняў. Па нас з вамі. Гэта галоўнае. Таму мы робім усё, каб не дапусціць вайны. Мы ўжо наеліся гэтай вайны. Яшчэ пакаленне, як я казаў, не памерла тое, якое ваявала. Нам гэтая вайна не трэба. Наша шчасце — у мірным жыцці. Мы не хочам больш сядзець у балотах і зямлянках.

*(Апладысменты.)*

А каб гэтага не здарылася, трэба быць моцнымі. Свет сёння такі, ён быў заўсёды такім. Моцных заўсёды і ўсюды паважалі. Таму мы павінны быць моцнымі.

З амерыканцамі вядзём перамовы. Павінен прама сказаць, ніколі, акрамя першай сустрэчы, яны не ставілі пытанне пра Расію. Я ім прама сказаў, Расія — гэта святое. Гэта родныя нам людзі. Усё роўна размовы, размовы. Я ім задаў пытанне: хлопцы, вы заўтра заменіце Беларусі Расію? Не. Так, пра што мы з вамі гаворым? Таму ў нас ёсць адна апора і надзея на захаванне нашага суверэнітэту, незалежнасці. Гэта блізкі, родны нам народ — расіяне, якія нам дапамагаюць ва ўсім. *(Апладысменты.)*

**І запомніце: гэта мая палітыка. З першага да апошняга дня сённяшняга майго прэзідэнцтва. Як бы ў Расіі мяне часам ні трапалі, і такі, і гэтакі, з-за рэўнасці. Я заўсёды зыходзіў з таго, што мы павінны быць разам.** Пуцін, Лукашэнка, людзі прыходзяць і сыходзяць, а краіны, народы застаюцца назаўжды. Вы ведаеце маю палітыку і пазіцыю. Пакуль я Прэзідэнт, мы ад гэтай палітыкі не адступім. Самыя блізкія сябры для нас — яны.

Дзякуй Сі Цзіньпіну. Пачалося з асабістых адносін да сучасных у эканоміцы. Вельмі моцна нам дапамагаюць. І калі б не было гэтых дзвюх краін, нам бы вельмі цяжка было, і мы б заўсёды памяталі, што мы пад санкцыямі. Яны добра нам дапамагалі. Мы гэта павінны разумець. І сёння дасведчаная Еўропа, гэты «райскі сад», мае па 400-500, зімой больш, долараў за прыродны газ, а мы — 120-100 долараў. А гэта эканоміка. Гэта нашы МАЗы, БелАЗы, гэта «Камволь» і іншыя прадпрыемствы, гарбарныя, ільняныя.

Вось таму што яшчэ трэба? Як гэтыя нашы збеглыя ціхушкі-лахушкі? «Мы падключымся да энергасістэмы Еўропы»... Вы што, з глузду з'ехалі? Вунь, Літва ад БРЭЛЛ адключылася, ад электраэнергіі. Імгненна ўзляцелі кошты. Людзі заплаціць не могуць. Гвалтам крычаць. Да дзяржаўнага ўжо перавароту даходзіць. А што яшчэ зімой будзе? Нас хочуць у гэта акунуць. Але справа не толькі ў тым, што мы вось атрымліваем гэтыя «пернікі». Майце на ўвазе, мы за гэта нічога не павінны. Мы пра гэта мала гаворым. Але мы гэтую бухгалтэрыю не падтрымліваем, якую нам часам некаторыя ва ўрадзе Расіі падкідваюць. А мы вам гэта, а мы вам гэта. Мы не гаворым усё тое, што мы робім для расіян. Калі б я стаў пералічваць, не ведаю, у чый бок быў бы рахунак. Але мы з прэзідэнтам Пуціным дакладна дамовіліся. Мы дапамагаем адзін аднаму. «Агрэсары», «суагрэсары». Няважна, што там пра нас гавораць. Мы павінны бачыць інтарэсы ўласнага народа.

Я яшчэ раз падкрэсліваю: беражыце гэтае сяброўства. Не дай Бог, мы дзесьці нахілімся і павядземся на гэтыя абяцанкі замежныя. Гэта пачнецца гібель нашай дзяржавы. Санкцыі — гэта не таму, што дыктатура, не таму, што Лукашэнка такі. Як быццам там на ўсходзе дыктатары меншыя, чым Лукашэнка. Але вы ж ведаеце, іх там хапае. Але сябруюць. Багатыя. Грошы амерыканцам інвестуюць. Я вось нядаўна пераканаўся ў гэтых інвестыцыях. Будуюць усё: ад курортаў да ваенных аб'ектаў. І нічога што ў іх там дыктатура, манархія і гэтак далей. Не ў гэтым справа. Зараз ідзе барацьба, канкурэнцыя жудасная. Усе разумеюць, што эканоміка перш за ўсё. І ў гэтай канкурэнцыі пачалося бязлітаснае ўдушэнне сваіх канкурэнтаў. Калі не са зброяй. Ну як супраць беларусаў ваяваць ці супраць расіян? Гэта ж супраць галоўнага ядзернага цэнтра сусветнага — Расіі — ваяваць. Не. Пачалі душыць санкцыямі. А чаго там па дробязі? Танкер ўзарвалі з нафтай. Яшчэ чагосьці там, нанеслі ўдар. Ну ведаеце, як слана камар укусіў. Так, непрыемна. Але перажывём.

Але перш, чым ты танкер узарваў з расійскай нафтай, ты падумай, што будзе потым. Таму цяжкая сітуацыя на сённяшні дзень. Але мы павінны вытрымаць. Мы ўжо навучыліся крыху за 5 гадоў, як увялі супраць нас санкцыі. Я вам нагадаў пра гэты самалёт. Памятаеце, калі казалі: «Вось, Пратасевіч! Так? Рамана Пратасевіча схапілі, арыштавалі, пасадзілі самалёт, каб арыштаваць». Я што толькі ні рабіў, каб ім патлумачыць: «Хлопцы, самалёт у Вільнюс ляцеў, над Вільнюсам быў. Садзіце яго ў Вільнюсе». Была пагроза выбуху. Навошта вы развярнуліся з Вільнюса, заляцелі з поўдня і пачалі садзіць гэты самалёт у Беларусі? Ваенныя дакладваюць: «Ён наш чалавек, сядзіць там».

Цяпер гэта вядома, што ён наш чалавек. Але супраць нас увялі санкцыі. А мне дакладваюць. Кажу: «Госпадзі, што ж рабіць? Нам жа не трэба, каб ён у Мінску садзіўся. Трэба ў Вільнюс». Ваенным кажу: «Падымайце ўсе інструкцыі і дзейнічайце паводле інструкцый».

Хрэнін кажа: «Трэба знішчальнік узнімаць, суправаджаць, раптам што здарыцца?». Кажу: «Уздымай. Трэба два? Два, тры, пяць падымаць, але каб было ўсё па інструкцыі». Суправадзілі, у хвасце, гэта ж аб'ектыўнага кантролю матэрыялы. Пасадзілі ў Мінску, зрабілі ўсё. І потым Тэртэлю кажу: «Арыштоўвай яго, як ворага народа».

Вось аперацыя, у чым быў сэнс, увялі санкцыі. Ну дык вы зараз папрасіце прабачэння і адмяніце іх. Не таму, што там наш чалавек у самалёце, якога нам прыйшлося арыштоўваць, а таму, што вы не мелі рацыі. Мы зрабілі ўсё па інструкцыі. А вось у вас якая была задума? Мы да гэтага часу не ведаем.

Гэта, як перамовы з амерыканцамі: «Ну прайгралі, — вось у апошні раз кажу Джону, — ну прайгралі. Але вы прызнайцеся, што вы прайгралі. І будзем далей будаваць адносіны. Я ж не дурань, разумею, што вы будзеце нас пастаянна душыць». А нам трэба супрацiўляцца. А нам трэба ў гэтай барацьбе выйграць. Таму што выходзіць і галасіць па беларуска-яўрэйскім сцэнары. Ну, людзі такія. Мы ўвесь час плачамся, плачамся. Як яўрэі мне казалі ў Ізраілі, калі я першы раз паехаў: «Ведаеце, у чым наша была праблема? Што мы, калі нас білі па правай шчацэ, падстаўлялі левую». Міратворцы. Іх вядуць у возера, у рэчку, вось загінуць — яны ідуць спакойна, не супраціўляюцца. Рэлігія. Рэлігія ў тым, што калі цябе б'юць, трэба адказваць. А лепей за ўсё, каб бойкі не было. І мы для гэтага робім усё, і нашы Узброеныя Сілы. Вы толькі падумайце, Брусель Польшчы выдаткаваў 44 мільярды еўра. 11 мільярдаў долараў дабавілі Злучаныя Штаты Амерыкі. 15 мільярдаў еўра — краінам Балтыі. Слухайце, калі ўсе краіны прадаць, там 15 мільярдаў не будзе. Выдаткавалі. Ваенныя ведаюць. І мяне арыентуюць на гэта. Гэта што, абаронныя бюджэты? Яны закупляюць вялізную колькасць зброі. А нашы збеглыя крычаць: ён ядзерную зброю завёз. А дзе мы возьмем 50 мільярдаў долараў, каб вось так узбройвацца, як палякі і Захад? У нас такіх грошай няма. І быць не можа. Ні Кітай, і нават ні Расія не ў стане нам аказаць такую падтрымку. Значыць, трэба мець такое ружжо, каб бахнуць, і яны ведалі, што бахнем. Каб сюды не лезлі. Вось у чым сэнс.

*(Апладысменты.)*

Калі сцісла аб сітуацыі, якая фарміруе сёння гэтую павестку, трэба сказаць так: міру няма, але за прэмію міру ідзе барацьба.

*(Апладысменты.)*

Я перадаў Трампу і Меланіі, абаім кажу, напісаў ім і амерыканцам перадаў: «Перадайце, кажу, Трампу, няхай ён не турбуецца, што яму не далі гэтую прэмію. У наступным годзе дадуць». Гэта па-першае. А па-другое, калі б мне гэтую прэмію прапанавалі, я б звар'яцеў. Гэта ж у той камарыллі, якім сёння даюць прэмію міру. Гэта ж трэба там з імі ў адной кампаніі быць...

Якая прэмія міру? Гэта ж ганьба сёння. Куды, куды Трамп, кажу, ваш лезе? Нашто яму гэта? Ён зусім іншы чалавек. Не. Далі гэтай жанчыне з Венесуэлы. Я пацікавіўся. Нейкая жанчына заклікала разумны калектыўны Захад нанесці ўдар па Венесуэле. Вайна супраць уласнага народа сёння ацэнена прэміяй міру. Гэта што? Кажу Трампу: «У гэтай лінейцы тваё месца?» Дык няма і быць не можа. Таму галоўнае — гэта вайна, вайна ў эканоміцы, гандлёвыя войны. У іх нічога не атрымалася з гэтай глабальнай эканомікай, яны ўжо адыходзяць ад гэтага. Ім давай сёння адасобленыя нацыянальныя эканомікі. І вось паглядзіце, што будзе з Еўрапейскім саюзам.

**У нас свой шлях. Ён без ілюзій. Мы жывём пад палітычным, эканамічным ціскам усю суверэнную гісторыю. Гэта цана незалежнасці.**





# СПРАЎ

Як не стала СССР, так і трымаем гэты ўдар, але працуем і выходзім з гэтага становішча. Арыентуемся на знешнія рынкі. І Кітай, і Індыя, Расія, краіны Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі. Гэта сусветная большасць. І мы частка гэтай сусветнай большасці, як бы камусьці гэтага не хацелася.

*(Апладысменты.)*

**Эканамічны баланс цалкам зрушваецца на карысць глабальных Усходу і Поўдня, і мы ў гэту сістэму ўключаны. Будучыня за такімі краінамі, аб'яднаннямі, як БРІКС, ШАС, дзе нас чакаюць і з задавальненнем прымаюць.**

**Расійская Федэрацыя — наш асноўны саюзнік.**

Я тут скарачаюся, не буду ўсё гэта характарызаваць, нешта сказаў, мы гэта апублікуем спецыяльна для вас...

Пытанні нашага саюзнага будаўніцтва — пытанне нумар адзін. Мы будзем усё рабіць для таго, каб наш саюз быў моцным. Мы з Пуціным сыдзем, прыйдуць маладыя людзі, але яны павінны мець аснову, фундамент на якім яны выбудуюць гэты саюз. Я лічу, што ўраду і парламенту трэба ўдзяліць асаблівую ўвагу гэтай рабоце, сістэмнай, з расіянамі, па фарміраванні агульных, галіновых рынкаў. Мы не замежнікі для Расіі, так як і яны не замежнікі і не чужыя для нас. Беларускае старшынства ў ЕАЭС дало нам магчымасць засяродзіць увагу на парадку дня арганізацыі і па-добраму ўзварушыць гэту арганізацыю. Летась ЕАЭС споўнілася дзесяць гадоў. Сёння мы бачым двухразовы абарот тавараабароту краін — членаў саюза, павелічэнне ВУП амаль на 18 %, а прамысловай вытворчасці на 30 %. Вось і ўсе санкцыі.

У наступным годзе будзем адзначаць 35 гадоў утварэння СНД. І тут добрая пляцоўка для таго, каб намячаць перспектывы, для таго, каб арыентавацца і глядзець у будучыню. Кітайская Народная Рэспубліка — гэта другі пасля Расіі гандлёвы партнёр. І сёння абсалютны лідар у свеце. Сустракаючыся з амерыканцамі, у інтэрв'ю, калі вы глядзелі, я сказаў амерыканцам, даўно яшчэ: «Вы спазніліся роўна на 25 гадоў, і ніякі Кітай вы сёння не спыніце, не ў стане. З Кітаем можна толькі дамовіцца». Кітайцы, яны спакойна, нікуды не спяшаюцца, але яны ідуць да сваёй мэты. Гэта найстаражытнейшая цывілізацыя. Да яе трэба так і адносіцца.

> **Свет стаў іншым. Свет сёння не зменіцца. Да свету гэтага трэба прыстасавацца.**

І нам, шаноўныя сябры, найперш. Так, я кажу пра нейкія прарыўныя кірункі, але заўсёды тут трымаю — прыстасавацца. Перажыць гэты час. Па-беларуску, памяркоўна, спакойна. Разумных людзей у нас больш, чым трэба. Трэба проста страсянуцца. Трэба разумець, што за нас ніхто нашых праблем не вырашыць.

**Цэлы шэраг найважнейшых дамоўленасцяў мы дасягнулі на вышэйшым узроўні. У многіх краінах. Там дзівосны попыт на нашу прадукцыю. Павінны ўключацца па-сапраўднаму і ўрад, і Міністэрства замежных спраў, асабліва нашы дыпламатычныя замежныя прадстаўніцтвы. Трэба працаваць.** Але гэтая размова не павінна быць на гэтых: «вы старэйшы, я малодшы». Гэта размова на роўных. Не бывае народаў малых і вялікіх, слабых і моцных. Любы народ — гэта народ. Для мяне беларускі народ – гэта самы моцны, мужны народ, таму што я яго Прэзідэнт. І для мяне галоўнае — адстойваць гэтыя інтарэсы.

*(Апладысменты.)*

Мы нямала зрабілі ў сферы культуры. Ня буду гэта характарызаваць. Часам ужо ў нас перабор можа быць з аднаўленнем замкаў. Недзе, можа, трэба не такімі тэмпамі дзейнічаць. Іх трэба адраджаць. Нікуды не падзенемся, гэта наша гісторыя. Можа быць, нам не столькі трэба гэтых «Славянскіх базараў», «Купалле» ў Александрыі і гэтак далей, але яны ўжо ёсць. Яны сталі прывычнымі. Давайце на гэтым спынімся і зробім іх больш якаснымі. Гэта будзе для нас пытанне пытанняў.

У спорце — пакуль куляемся. Мой лозунг аб тым: абыгрывайце расіян. Ну ніхто ж не перашкаджае. Вунь біятланісты нашы бегаюць, як трэба, страляюць — выйграюць. Хакеісты «Дынама» — то выйграюць, то прайграюць, ну, быццам бы, нічога. А астатнія, акрамя батутыстаў? Ну, гэта мы з Кавальчуком (Міністр спорту Сяргей Кавальчук. — **Заўв. рэд.**) разбяромся.

Таму ўсё ў нас ёсць. Усё ў нас ёсць дзеля таго, каб жыць, працаваць. Нармальна працаваць. Толькі часцей трэба глядзецца ў люстэрка. Не трэба ківаць на іншых, бо ад гэтага лепш не стане. Калі ў цябе ёсць сям'я — ты ажаніўся, сям'я — ну дык ты адказваеш за тую жанчыну, дзяўчынку, якую ты прывабіў на свой бок. Дзеткі нарадзіліся — ну дык ты думай пра іх. Я ж сказаў, трэцяе — гэта маё. А дваіх хто карміць будзе? Яны павінны разумець, што з верталёта грошы не скідваюць. Калі мы сямейны капітал, яшчэ штосьці мамам, татам, сем'ям, бясплатная ежа ў дзіцячым садку (жабрацкая зарплата для тых, хто глядзіць па 15-20 дзяцей) — гэта ж не з верталёта. Гэта ж мы сабралі ўсім светам і табе далі. А ты працаваць не хочаш.

> **Паважаныя суайчыннікі, якім будзе свет заўтра, мы не ведаем. Якой будзе Беларусь, залежыць толькі ад нас.**

*(Апладысменты.)*

Таму давайце на кожным сваім працоўным месцы, на кожным, на кожным месцы — тое, што я прашу, гэта ж элементарна — будзем займацца сваёй справай. Будзем рабіць усё. Калі хтосьці пайшоў на пенсію, але яшчэ нешта можа, прыйдзі і скажы: «Магу». З задавальненнем прымем тваю дапамогу. Кожны сёння думаць павінен аб тым, каб наша краіна развівалася. Але калі, я яшчэ раз паўтараю, не можам шмат, давайце пакрысе кожны год дадаваць. Час цяпер такі – не для глабальных, тэктанічных зрухаў. Час такі, калі трэба проста часам прыстасавацца і выжыць. Недзе перачакаць, але бачыць свой інтарэс. Выбачайце вось за гэту банальшчыну, за гэту народную шчырасць. Давайце будзем рабіць усё, каб для нашых дзяцей было месца, дзе жыць. Я памятаю, што за Прэзідэнтам застаецца вырашэнне стратэгічных пытанняў. Ну, пішаце вы там у сваіх «цік-токах», каб я абкасіў вам тэрыторыю, дровы пакалоў. Дзякуй богу, я ўмею гэта рабіць — я прыйду, гэта зраблю. Аднак гэта дзвюм-тром сядзібам. Але вы памятаеце, што гэта ваша задача.

Мая задача — вырашэнне стратэгічных пытанняў. У мяне гэтых пытанняў дастаткова. І перагаворы на знешнім трэку, і не толькі кантроль за сілавымі структурамі — паспрабуй гэтага Хрэніна (Міністра абароны Віктара Хрэніна. — **Заўв. рэд.**) з Кубраковым (Міністра ўнутраных спраў Івана Кубракова. — **Заўв. рэд.**) пракантраляваць — не, я ў добрым сэнсе кажу. Я ўжо рады, што народ перастаў вас там крытыкаваць і дзяўбці, як гэта было калісьці. Значыць, адчуў, што «дрэнная» міліцыя, але яна наша. «Дрэнныя» ваенныя, але яны нашы. І яны такія, як усе мы. Гэта ж нашы дзеці. Таму, калі вы кідаеце ў агарод нашай міліцыі камень, вы памятайце, што гэта злепак з нашага грамадства. І што там розныя людзі: ёсць патрыёты, ёсць героі. Вось мы не надалі галоснасці трохдзённай даўніны затрыманне мярзотніка там – ну, як мы яго, бэчэбэшніка, называлі — ліквідаваны. Але параніў траіх нашых хлопцаў. Усе жывыя, Іван? (Прэзідэнт звярнуўся з пытаннем да міністра ўнутраных спраў Івана Кубракова. — **Заўв. рэд.**). Усе жывыя. Адзін цяжка паранены, двое лягчэй. Але яны баранілі нас. Вось яна, гэтая наша моладзь. Таму, разумееце, што, калі недзе нешта не так — гэта мы з вамі. І нас 1200 чалавек на нашу кампактную краіну. Мы можам вырашыць любое пытанне. Мы можам здзейсніць любы пераварот, не толькі ў розумах нашых людзей. Давайце гэтыя перавароты, каб яны былі на карысць нашаму грамадству.

> **Час выбраў нас. І гэта час канкрэтных спраў.**

Магчыма, я не ўсіх пераканаў у тым, што нам трэба абавязкова зрабіць. Магчыма, не знайшоў патрэбных слоў. Але як кажа моладзь — вось тое, што вам зойдзе, я хачу сказаць напрыканцы. Я ведаю, з чым вы павінны абсалютна дакладна пагадзіцца і прымеце сэрцам. Мы, наша пакаленне, не можам перакласці нявырашаныя праблемы і пытанні на плечы нашых дзяцей. Не маем на гэта права.

*(Апладысменты.)*

Мы не маем на гэта права. Я пераканаены — не толькі я, які напісаў гэтыя радкі, але і вы — таму што нам не ўсё роўна, што будзе пасля нас. Што будзе з імі, што ідуць за намі, з нашымі дзецьмі. І вам таксама не ўсё роўна.

> **Час, выклікі вельмі жорсткія. Таму давайце зробім усё, што мы павінны зрабіць.**

А яны прыйдуць пасля нас: калі захочуць скарыстацца нашым вопытам, яны ім скарыстаюцца. Не — яны будуць будаваць краіну для сябе.

Дзякуй.

*(Бурныя апладысменты.)*






# «ПРАЎДА НА НАШЫМ БАКУ, І ЧАС

## Пасля звароту з Пасланнем беларускаму народу


Фота БелТА.

### «МЫ НЕ ПОЙДЗЕМ НА ТОЕ, КАБ ДАПУСЦІЦЬ ЯШЧЭ НЕКАЛЬКІ ПАМЫЛАК І ПАЎТАРЫЦЬ 2020 ГОД»



**Дэлегат УНС, член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім ГІГІН спытаў кіраўніка дзяржавы аб стане беларуска-амерыканскіх адносін.**

Прэзідэнт адзначыў, што ён прыхільнік таго, каб не ствараць лішняга шуму, пакуль пра нешта не дамовіліся. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, спектр тэм, якія абмяркоўваюцца з амерыканскім бокам, даволі шырокі: ад пытанняў мірнага ўрэгулявання ва Украіне да аднаўлення работы амерыканскага пасольства ў Мінску.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Мы не пойдзем на тое, каб дапусціць яшчэ некалькі памылак і паўтарыць 2020 год. 2020 года ў Беларусі больш не будзе. Мы ведаем пра свае інтарэсы. Мы не хочам, каб амерыканцы былі нашымі сапернікамі і ворагамі. У нас мэта — наладзіць з імі адносіны. Ужо просяць планаваць далейшыя сустрэчы і размовы. Усё ідзе, як яны сказалі, да вялікай здзелкі. Мы павінны з Трампам сустрэцца і дамовіцца. З іх боку яны гарантуюць зняцце ўсіх санкцый. Праўда на нашым баку, і час усё расставіць на свае месцы».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што з амерыканцамі вядзём вельмі цяжкі дыялог. «Нам трэба з імі выбудоўваць адносіны (з ЗША). Як гэта робяць іншыя. Ні ў якім разе не за кошт іншых краін. Балазе, з Пуціным у нас поўнае разуменне таго, што адбываецца. Мы абмяркоўваем гэтыя праблемы, сустракаемся часта», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

### «НАМ НАВОШТА ВАЯВАЦЬ, КАЛІ ГЭТА МОГУЦЬ ЗРАБІЦЬ ІНШЫЯ?»



**Палітолаг Юрый ВАСКРАСЕНСКІ адзначыў, што апошнія памілаванні кіраўніка дзяржавы ў дачыненні да асоб, якія здзяйснялі тэрарыстычныя і экстрэмісцкія злачынствы ў Беларусі, выклікалі бурныя абмеркаванні ў грамадстве, асабліва сярод прыхільнікаў Прэзідэнта. Ён удакладніў, што людзі пытаюцца: чаму менавіта гэтыя верхаводы, а не асноўная маса, якая паддалася на заклікі і ў выніку была асуджаная, былі вызвалены. Больш за тое, на асобных рэсурсах з'яўляюцца каментарыі аб тым, што «ядзерны электарат» і сілавікі гэтае рашэнне нібыта не падтрымалі.**

«Наконт «ядзернага электарату», расколвання і гэтак далей... Ведаеце, гэта выдаванне жаданага за сапраўднае, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Чаму такія размовы ідуць? Яны проста не інфармаваныя ў дастатковай ступені».

Па словах кіраўніка дзяржавы, краіна нічога атрымае ад таго, калі той жа Бабарыка будзе ўтрымлівацца ў месцы пазбаўлення волі да таго, пакуль не сыдзе з жыцця натуральным шляхам. «Што мы выйграем ад гэтага? — пацікавіўся Прэзідэнт. — Дакладна так жа было пра гэтага сужэнца (Ціханоўскага. — **«Зв.»**). Ён, бедны, у яе (Святланы Ціханоўскай. — **«Зв.»**) затрымаўся на двое сутак. Цяпер жыве ў Амерыцы, часам туды-сюды перамяшчаецца, ужо адкрыў вайну супраць гэтага офіса ў Літве. А той офіс не ведае куды дзявацца: то ў Польшчу, то ў Літву. Хто гэта зрабіў? Сяроэка. Ну нам навошта ваяваць, калі гэта могуць зрабіць іншыя?»

Што датычыцца рашэння аб памілаванні, па словах Аляксандра Лукашэнкі, яно было прынята ў рамках перагавораў з амерыканцамі. «Усе гэтыя абмены, размены — жаданне перагаворшчыкаў Злучаных Штатаў Амерыкі, — удакладніў ён. — Хочаце забіраць — забірайце. Можна было іх не выпускаць. Некаторыя ў нас там яшчэ знаходзяцца. Няхай там у сябе ў Германіі ствараюць дадатковы офіс, змагаюцца за гранты, змагаюцца за грошы ў Брусэлі. Няхай змагаюцца. Гэта што — нам у шкоду? Навошта, каб яны выйшлі праз год-два і стварылі вам тут праблемы? Не толькі мне. Да нас яны не прыедуць».

Пры гэтым беларускі лідар папярэдзіў, што нашы грамадзяне не павінны дапусціць такой сітуацыі, каб яны да нас вярнуліся.

### «Я ЎСЯЛЯК СПРАБУЮ ПАЗБЕГНУЦЬ КАНФРАНТАЦЫІ»



**Дэлегат УНС, член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Аляксандр ШПАКОЎСКІ пацікавіўся ў кіраўніка дзяржавы, якім чынам неабходна ўзаемадзейнічаць з нашымі суседзямі, у прыватнасці з Літвой.**

«Скажу шчыра: мая пазіцыя простая. Каб разабрацца з Літвой, шмат часу не трэба — любымі метадамі. Але крый божа развязаць нейкую вайнушку. Пытанне ж нават не ў вайне і не ў часе. Пытанне не ў гэтым. А пытанне ў тым, што (я амерыканцам спрабую ўкласці гэта ў галаву) вайна — гэта асаблівы перыяд у жыцці любога грамадства. Ну, гэта ж жыццё. Цяжкае жыццё. І ў гэтай сітуацыі нельга прадказаць да 100 працэнтаў, як будуць развівацца падзеі. Паварот можа быць самы неверагодны. Таму я ўсяляк спрабую пазбегнуць канфрантацыі», — падкрэсліў беларускі лідар.

Паводле слоў Прэзідэнта, нашы суседзі ведаюць, да чаго гэта можа прывесці, бачаць, што робіцца на поўдні нашай краіны. «Таму ніякай канфрантацыі няма. І потым, трэба разумець, што любая вайна не са стральбы пачынаецца. Вы паглядзіце: з расійскай мовы на Данбасе пачалося ўсё, а потым у Адэсе спалілі, а потым пераварот зладзілі, а потым Дэбальцава, там яшчэ ў аэрапорце Данецка стральба пачалася, колькі людзей загінула, загубілі... Вось так паволі гэта ўсё пачынаецца», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

«Таму я спрабую пазбегнуць усялякай эскалацыі ў палітыцы, дыпламатыі, у эканоміцы, — акцэнтаваў увагу кіраўнік дзяржавы. — Я сапраўды так лічу — трэба дамаўляцца. Трэба садзіцца, абмяркоўваць пытанні і дамаўляцца. Калі твой праціўнік не перайшоў чырвоную рысу, як у нас модна стала казаць. Ну калі чалавек перайшоў чырвоную рысу — гэта агрэсія супраць Беларусі. Для нас гэта немагчыма, мы адкажам».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, нашы суседзі павінны выдатна разумець: ніякія немцы і амерыканцы за іх ваяваць не будуць.

### «НІЧОГА Ў ІХ НЕ АТРЫМАЕЦЦА»



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» Дзмітрый ЖУК звярнуў увагу, што, дзякуючы збеглым, у палітычным ландшафце з'явіўся новы тэрмін — «палітычны махляр» або «палітычнае махлярства». «Так называюць людзей, якія, не маючы адносін да пэўных працэсаў, з усіх сіл да іх прымазваюцца», — удакладніў ён. Прывёўшы ў прыклад тых, хто спрабуе прыпісаць сябе дачыненне да беларуска-амерыканскіх перагавораў, Дзмітрый Жук пацікавіўся, як да гэтага адносіцца Прэзідэнт.**

«Галоўнае для іх цяпер (і яны марнуюць на гэта, дурні, грошы) — паказаць, што яны вырашаюць пытанні: вызваленне гэтых палітзняволеных, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Дзякуй Коўлу (спецпасланніку ЗША ў Беларусі. — **«Зв.»**), які прама сказаў: «100 % гэта работа амерыканцаў». Я б дадаў: «Не толькі амерыканцаў, але і беларусаў у тым ліку». На нас немагчыма націснуць. Не таму, што мы такія героі. Мы ведаем сваіх сяброў. І ведаем, на каго абаперціся. Я вельмі часта абапіраюся на магутнасць Расіі, наша сяброўства з Сі Цзіньпінам, з Кітаем і многімі іншымі».

Тыя, хто перабольшвае сваю ролю ў беларуска-амерыканскіх перагаворах, прыстасоўваюцца да сітуацыі. «Яны гатовы лізаць любы бот, але толькі каб атрымаць нейкую капейку, — растлумачыў кіраўнік дзяржавы. — Шарлатаны. Правільна, махляры ад палітыкі. Гэта нармальны для іх тэзіс. І нічога ў іх не атрымаецца».

Па словах беларускага лідара, галоўнае для збеглых — выжыць, таму яны гатовы піярыцца. Прэзідэнт нагадаў і аб планах збеглых захапіць Кобрынскі раён, парэкамендаваўшы ім набрацца вопыту на фронце. «Ляпаюць языкамі, вы гэта бачыце, да справы не дойдуць, — канстатаваў ён. — Але іх заходнія спецслужбы ўжо падштурхоўваюць: «Хлопцы, размовы скончаны, трэба ўжо ваяваць, трэба нешта рабіць»».

### «НАША ГАЛОЎНАЯ ЯКАСЦЬ — ПРАЦАВАЦЬ»



**Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Алег КУЗЬМІН пацікавіўся меркаваннем беларускага лідара наконт прыцягвання падрастаючага пакалення да формы грамадска карыснай працы.**

«Адназначна школьнікі павінны займацца грамадска карыснай працай, — перакананы Прэзідэнт. — Асабліва гарадскія».

Па словах кіраўніка дзяржавы, нават у сельскай мясцовасці людзі настолькі разленаваліся, што не хочуць на сваім падворку нават яблыню якую дзеля сваіх дзяцей пасадзіць. «Трэба працаваць, — падкрэсліў беларускі лідар. — Калі фізічнай працай ты ў школе, у маладосці не займаешся, з цябе толку не будзе. Што мы папракаем нашых дзяўчат? Ім замуж няма за каго выходзіць».

Па словах кіраўніка дзяржавы, усё пачынаецца з працы. «Гэта наша галоўная якасць, беларусаў, — працаваць, — падкрэсліў ён. — Страцім — хана нам. Таму трэба гэта

# УСЁ РАССТАВІЦЬ НА СВАЕ МЕСЦЫ»

## і парламенту Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні з залы

зберагчы. Таму я адназначна настойваю, каб школьнікі, не гаворачы ўжо аб больш дарослых дзецях, займаліся працай. Праца надае высакароднасць чалавеку. Не я сказаў».

### ЦІ МОЖА ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ ПРЫВЕСЦІ ДА ДЗЯРЖПЕРАВАРОТУ?



**Дэпутат Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, генеральны дырэктар інфармацыйнага агенцтва «Мінск-Навіны» Андрэй КРЫВАШЭЕЎ спытаў у кіраўніка дзяржавы, як чалавеку канкурыраваць з нейрасеткамі.**

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што не верыць у тое, што штучны інтэлект зможа замяніць чалавека, і не хоча, каб гэта адбылося. «Не ведаю. Даўно спрабую адказаць сабе на гэтае пытанне», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што раней, падчас паездак у Эміраты, яго знаёмілі з развіццём гэтай сферы. Аднак ён пакуль не верыць, што штучны інтэлект можа перасягнуць чалавека. «Як большасць людзей, я пакуль у гэта не веру. Мне цяжка разважаць на тую тэму, бо я не ведаю. Пакуль гэта разважанні», — адзначыў ён.

Тым не менш пэўныя моманты, упэўнены кіраўнік дзяржавы, трэба ўлічваць. Ён нагадаў, напрыклад, пра распаўсюджанае ў інтэрнэце відэа, дзе з дапамогай штучнага інтэлекту было згенеравана яго выступленне ў парламенце на французскай мове. «Прыглядзеўся — а міміка зусім іншая. А хто там з людзей будзе разбірацца... Гэта да чаго можа прывесці? Да дзяржаўнага перавароту. Перавярнуць краіну могуць. З гэтым трэба лічыцца», — адзначыў Прэзідэнт.

### «ЛЮДЗЯМ ТРЭБА ВАРУШЫЦЦА, КАЛІ МЫ ХОЧАМ ДОБРА ЖЫЦЬ»



**Дэпутат Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, аглядальнік тэлеканала «СТБ» Яўген ПУСТАВОЙ спытаў у Прэзідэнта, як ён адносіцца да зваротаў да яго праз TikTok, у якіх кіраўніка дзяржавы просяць пакасіць траву, выправіць сітуацыю з чэргамі на запраўках і нават просяць парад у выхаванні дзяцей. Дэпутат указаў і на такую з'яву, як утрыманства, і спытаў, як можна ад яе ўвогуле пазбавіцца.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што спрабуе рэагаваць на ўсё, што бачыць у тым ліку і ў інтэрнэце, хаця, па яго словах, гэта ўжо перабор. «Можна не рэагаваць, на пэўныя рэчы я не рэагую, — сказаў ён. — Дзесьці жорстка рэагую, але калі пачынаем разбірацца — хлусня». Пасля разбіральніцтваў па выніках тых ці іншых скаргаў у інтэрнэце высвятляецца, што і прозвішчаў такіх няма, і факта таксама. Іншая справа, калі факт пацвярджаецца.

Прэзідэнт перакананы, што віна прадстаўнікоў улады ў тым, што такія рэчы трэба папярэджваць. «Калі касіць, то старшыня сельскага Савета павінен касіць, — канкрэтызаваў ён. — Або наперадзе ісці, а следам за ім талакой, натоўпам усе павінны ісці касіць. Тады людзі будуць разумець: пішы — не пішы, ён косіць — і я касіць пайду».

Такім прынцыпам Прэзідэнт заўжды кіраваўся будучы кіраўніком сельскагаспадарчага прадпрыемства. І цяпер нярэдка сам паказвае прыклад. «Цяпер трэба не ісці, а бегчы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падтрымлівае, што ўтрыманства можа прывесці да сумных наступстваў. «Людзям трэба варушыцца, калі мы хочам добра жыць», — дадаў ён.

### ЯКАЯ САМАЯ МОЦНАЯ ЗБРОЯ ЁСЦЬ У ТРАМПА?



**Ад палітыка Ганны КАНАПАЦКАЙ прагучала пытанне, ці не варта заняцца рэпатрыяцыяй у Беларусь грамадзян, якія маюць беларускія карані. «Можа быць, пачнём з таго, што скарыстаемся вашымі добрымі адносінамі з амерыканскім прэзідэнтам і запросім сям'ю яго зяця Джарэда Кушнэра, які мае беларускія карані, напярэдадні значнага для яўрэйскага народа свята. Для таго, каб яны наведалі свае радавыя месцы», — прапанавала Ганна Канапацкая.**

«Колькі б я ні стараўся, рэпатрыяваць Кушнэра ў Беларусь у мяне наўрад ці атрымаецца, — з доляй гумару адказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я абавязкова буду старацца. Калі шчыра, я запрашаў праз Аляксандра Генрыхавіча (Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр Турчын. — **«Зв.»**). Ён у нас адтуль (продкі Джарэда Кушнэра з Навагрудскага раёна. — **«Зв.»**). Мы запрашалі амерыканскага пасла ў Францыі. Гэта бацька Кушнэра — Чарльз. Мы і яго запрашалі, падтрымліваем з ім адносіны, ён адгукаецца, мы размаўляем. Тое ж самае і з Кушнэрам. Ну, нeяк ці не дайшоў да іх сігнал. Але пры сустрэчы з Трампам я абавязкова ад твайго імя яму пра гэта нагадаю.

Апошнім разам я Джону Коўлу (спецпасланнік ЗША па Беларусі. — **«Зв.»**) сказаў: «Ты перадай Трампу, чаму вы не выкарыстоўваеце самую моцную зброю, якая ў яго ёсць? Меланія Трамп. Яна ж наш чалавек, яна славянка — са Славеніі. Яна шмат чаго магла б і ва ўкраінскім канфлікце, і ў Беларусі. Трэба яе выкарыстоўваць у гэтым плане. Я ім прапанаваў. Прычым сур'ёзна прапанаваў, каб Меланія больш удзельнічала ў вырашэнні палітычных пытанняў. Думаю, для Трампа гэта было б нядрэнна. Не толькі Кушнэра прыцягваць да вырашэння — у Газе, ва ўкраінскім канфлікце ж нямала зрабіў, шчыра кажучы. Не толькі Кушнэра, але і Меланію трэба прыцягваць».

### «ТОЛЬКІ МІРНАЕ ВЫРАШЭННЕ ЎКРАІНСКАГА ПЫТАННЯ ДЛЯ НАС КАРЫСЦЬ»



**Намеснік начальніка факультэта па вучэбнай і навуковай рабоце — начальнік вучэбна-метадычнага аддзела факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сіл Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь, палкоўнік Андрэй БАГАДЗЕЛЬ спытаў у Прэзідэнта, калі, на яго думку, скончыцца канфлікт ва Украіне. Ён таксама звярнуў увагу на пазіцыю некаторых нашых ворагаў, якія кажуць пра тое, што Прэзідэнту Беларусі і ваенна-палітычнаму кіраўніцтву нашай краіны нібыта нявыгадна заканчэнне канфлікту ва Украіне.**

«Гэта людзі, якія не думаюць, — адказаў Аляксандр Лукашэнка. — Для мяне вельмі небяспечна падаўжэнне гэтага канфлікту. Гэта можа такі паварот быць, які нам і не сніўся».

У сувязі з гэтым Прэзідэнт падзяліўся адным інсайдам, расказаўшы, што зусім нядаўна ўкраінцы папярэдзілі нас па каналах спецслужбаў, што яны будуць збіваць расійскія беспілотнікі, якія залятаюць на нашу тэрыторыю. У адказ Аляксандр Лукашэнка папрасіў перадаць, што гэта будзе мець далёка ідучыя наступствы: «Што, яны абсалютна перакананыя, што гэта будуць расійскія ці нямецкія беспілотнікі? Над намі лётаюць не толькі расійскія, але і ўкраінскія беспілотнікі. Я гэта кажу да таго, каб вы разумелі, які паварот можа адбыцца — мы можам адказваць. Цішыня. Разумеюць. Але вы разумееце, у што гэта можа пераўтварыцца. Таму для мяне вельмі нязручны працяг і асабліва эскалацыя гэтай вайны. Калі раскінуць мазгамі, нам, Беларусі, гэта не трэба. Наадварот, калі вайна скончыцца, мне гэта вельмі выгадна, бо я займаю міралюбную пазіцыю. Мы заўсёды займалі і займаем гэту пазіцыю. Толькі мірнае вырашэнне ўкраінскага пытання для нас карысць».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што і Украіна без нас таксама не абыдзецца, таму што ніякія амерыканцы і еўрапейцы без выгады для сябе аднаўляць краіну не будуць. Гэтым будуць займацца Беларусь і Расія. Што датычыцца канца вайны, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што бакі як ніколі блізкія да мірнага вырашэння: «Трэба дамаўляцца. Гэта мая сапраўдная пазіцыя», — падкрэсліў беларускі лідар.

### «ДА ІХ ТРЭБА АДНОСІЦЦА ЯК ДА БЕЛАРУСАЎ, ЯК ДА СВАІХ ЛЮДЗЕЙ»



**Старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Мікалай БУЗІН агучыў пытанне, якое, па яго словах, хвалюе людзей: працоўная міграцыя ў інтарэсах нашай эканомікі. На гэтай тэме, па меркаванні дэпутата, некаторыя спрабуюць атрымаць палітычныя дывідэнды, каб раскачаць краіну на гэтай тэме. Мікалай Бузін пацікавіўся стратэгіяй дзяржавы па лініі працоўнай міграцыі на бліжэйшую пяцігодку.**

«Вы бачыце, на 9,5 мільярда, а то і 10 (мільярдаў. — **«Зв.»**) прадуктаў харчавання прадалі», — канстатаваў беларускі лідар, удакладніўшы, што далёка не ўсе нашы суайчыннікі хочуць працаваць у сельскай гаспадарцы, чаго не скажаш аб мігрантах.

Па словах Прэзідэнта, сярод працоўных мігрантаў у нашай краіне — у асноўным, прадстаўнікі постсавецкіх краін, у якіх няма праблем з нараджальнасцю. «Гэта нашы людзі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, кажучы аб мігрантах. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што, перад тым як трапіць да нас на работу, яны праходзяць праверку, найперш па лініі міліцыі.

Па словах Прэзідэнта, працавітасці мігрантаў можна пазайздросціць. Гледзячы на іх, падцягваюцца і некаторыя беларусы, якія не хацелі працаваць. «Яны прыехалі — няхай працуюць, — сказаў беларускі лідар. — Але галоўнае (стратэгія мая) — да іх трэба адносіцца як да беларусаў, як да сваіх людзей. Гэта датычыцца і аказання медыцынскіх, і адукацыйных паслуг».

Па словах кіраўніка дзяржавы, хочам мы таго ці не, а вымушаны будзем прыцягваць мігрантаў. «Трэба ўзяць пад кантроль любыя працэсы, пакуль нам удаецца гэта», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка, маючы на ўвазе, што так ці інакш міграцыя непазбежная.

Па словах Прэзідэнта, многія мігранты працуюць так, што нашы людзі так працаваць не хочуць. У якасці прыкладу кіраўнік дзяржавы прывёў Віцебшчыну, дзе ўскрываюцца жудасныя факты халатных адносін да сваіх абавязкаў.

«Дык хутчэй бы прыехалі гэтыя туркмены, узбекі, жыллё дадзім, будзем падтрымліваць, галоўнае, каб працавалі тут і вынік пэўны давалі, каб вёска жыла, — акцэнтаваў увагу беларускі лідар. — Вось мая стратэгія. А не таму, што я хачу запаланіць Беларусь пакістанцамі. Такой мэты няма. Але трэба трымаць усё пад кантролем і па-чалавечы да іх адносіцца. І будзе вынік».

### «НАМ У ПЛАНЕ ЭТЫКІ СЯМЕЙНАГА ЖЫЦЦЯ ТРЭБА ПРАЦАВАЦЬ»



**Дэпутат Столінскага раённага Савета дэпутатаў, дырэктар Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, старшыня раённай арганізацыі Беларускага саюза жанчын Людміла МАРОЗ (шматдзетная маці) пацікавілася, як у краіне стымуляваць нараджальнасць. Яна перакананая, што нараджэнне вялікай колькасці дзяцей магчыма толькі пры вялікай любові да Радзімы, і да моладзі гэта трэба данесці.**

«Ну, ведаеш, мне з табой цяжка паспрачацца. Калі ў цябе пяцёра дзетак, ну што ты скажаш? І калі ты кажаш пра тое, што патрыятызм ляжыць у аснове, любоў да Радзімы... Я ўжо не ведаю, што можа быць лепш гэтага», — сказаў беларускі лідар.

Што датычыцца прапаганды і агітацыі за вялікую сям'ю, Прэзідэнт працытаваў аднаго з рэжысёраў, які казаў: «Калі няма пасцельнай сцэны і камусьці морду не разбілі да крыві, то гэта не кіно, яго ніхто глядзець не можа». Са слоў кіраўніка дзяржавы, мы адышлі ад тых савецкіх прынцыпаў, якія былі нармальнымі. «Нам у гэтым кірунку трэба працаваць, у плане этыкі сямейнага жыцця, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Я згодны, што этыка сямейнага жыцця — гэта вельмі важна. Але як гэта выкарыстоўваць і дзе — мы пра гэта падумаем».

У завяршэнне першага дня Сходу Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пасяджэнне прайшло дэмакратычна: усе, хто хацеў задаць пытанні, гэта зрабілі. «Я здзіўляюся вашаму гераізму, хоць я таксама з вамі гэты ўвесь час быў, — канстатаваў Прэзідэнт. — Мы абмеркавалі ўсе пытанні, якія вызначылі. Прэм'ер-міністр заўтра нам даложыць праграму, па якой мы будзем жыць найбліжэйшыя пяць гадоў. Я прасіў, каб гэта праграма была канкрэтнай, зразумелай для людзей, каб усе бачылі, у якім кірунку будзе развівацца Беларусь».

Рэзюмуючы, беларускі лідар выказаў удзячнасць аўдыторыі за цеплыню, якая адчувалася ў зале падчас першага дня пасяджэння УНС. «Вы ў сваёй большасці — тыя людзі, за якімі будучыня нашай краіны і будучыня нашых дзяцей, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Давайце зробім тое, што мы павінны зрабіць. Дзякуй вам».

**Вераніка КАНЮТА, Даніíл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

СЛОВА ДЭЛЕГАТАМ

# «ЯКОЙ БУДЗЕ БЕЛАРУСЬ — ЗАЛЕЖЫЦЬ ТОЛЬКІ АД НАС»

**Сваімі ўражаннямі і меркаваннямі пасля выступлення Прэзідэнта на пасяджэнні УНС падзяліліся яго ўдзельнікі.**

**Дэлегат УНС, Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА:**



— Усе гады працы нашага кіраўніка дзяржавы праводзіцца палітыка, арыентаваная на чалавека, стварэнне для яго камфортных умоў. Сваё Пасланне Прэзідэнт пачаў менавіта з эканомікі, таму што гэта аснова ўсяго. Аляксандр Рыгоравіч выразна расставіў прыярытэты: кожны павінен рабіць на сваім месцы тое, што павінен. Шчыра, прыстойна, адказна. Умацоўваючы эканамічную магутнасць краіны, мы такім чынам захоўваем яе суверэнітэт і незалежнасць — самае каштоўнае ў цяперашнім свеце. Прэзідэнт таксама заклікаў, каб за нейкімі вялікімі лічбамі, паказчыкамі мы не забывалі аб праблемах простых людзей. Без чалавека нічога не будзе. І вельмі важна, што выступленне, якое прагучала з вуснаў Прэзідэнта, было даступна для кожнага жыхара нашай краіны. Кожны для сябе зрабіў пэўныя высновы. Вы, напэўна, заўважылі, што яно (Пасланне. — **«Зв.»**), як заўсёды, датычылася абсалютна ўсіх сфер жыццядзейнасці. Кіраўнік дзяржавы бачыць, чым жыве грамадства, што людзі кажуць, абмяркоўваюць і, ведома, Аляксандр Рыгоравіч звяртае ўвагу на тыя пытанні, якія хвалююць беларусаў.

**Дэлегат УНС, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Ала СМАЛЯК:**



— Моцнае, глыбокае Пасланне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі беларускаму народу і парламенту, перакананая, адгукаецца ў сэрцы кожнага жыхара нашай краіны. У Пасланні ёсць выразны пасыл, арыенцір для прадстаўнікоў усіх сфер жыццядзейнасці, усіх галін улады. І ў кожным тэзісе — вялізны клопат пра будучыню краіны, пра яе развіццё, дабрабыт, бяспеку, суверэнітэт і незалежнасць, рост дабрабыту кожнага жыхара.

Кіраўніцтвам да дзеяння, лічу, павінны стаць магутныя словы нашага лідара: «Які будзе свет заўтра, мы не ведаем. Якой будзе Беларусь — залежыць толькі ад нас. Кожны павінен думаць, каб наша краіна развівалася. Давайце рабіць усё, каб для нашых дзяцей было месца, дзе жыць».

Гэтыя словы падкрэсліваюць значнасць актыўнай пазіцыі кожнага з нас — і грамадзянскай, і прафесійнай. Важна памятаць кіраўніку, настаўніку, прамыслоўцу, аграрыю, навукоўцу аб тым, што менавіта нашы штодзённыя рашэнні і ўчынкі, канкрэтныя справы фарміруюць аблічча будучыні нашай краіны. Ад узроўню нашай унутранай адказнасці, ад імкнення шчыра, добрасумленна працаваць на сваіх месцах, ад патрыятызму залежыць, якой стане Беларусь.

**Дэлегат УНС, старшыня канцэрна «Беллегпрам» Надзея ЛАЗАРЭВІЧ:**



— Кіраўнік дзяржавы ў Пасланні акцэнтаваў: беларускія тавары — наш гонар. Цяжкая прамысловасць: МАЗ, БЕЛАЗ, МТЗ, «Бабруйскагрмаш» — сапраўдныя брэнды. Але лёгкая прамысловасць таксама на вышыні: «Магатэкс», Аршанскі льнокамбінат, «Віцебскія дываны». Чаму на гэта звяртаю ўвагу? Гэта бяспека краіны. Лёгкая прамысловасць — не толькі прыгажосць, але і здароўе, абарона. Прэзідэнт падкрэсліў: на паліцах беларускіх крам павінна быць максімум беларускіх тавараў. Што датычыцца задач, агучаных Прэзідэнтам, мы іх выканаем. Прамысловыя прадпрыемствы набяруць патэнцыял, каб краіна была больш упэўненая і незалежная.

**Дэлегат УНС, намеснік начальніка па ідэалагічнай рабоце ваенна-транспартнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту Яўген ВІНІЧЭНКА:**



— Кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да беларускага народа і Парламента ў сваім Пасланні, сказаў важную рэч: «Наша шчасце — у мірным небе». Што датычыцца ваеннай сферы, Аляксандр Рыгоравіч адзначыў, што ваеннаслужачых неабходна падтрымліваць, увогуле неабходна весці мірную палітыку. Гэтымі словамі варта кіравацца, але мы, прадстаўнікі Узброеных Сіл, заўсёды пры неабходнасці гатовыя абараняць родную Беларусь.

**Дэлегат УНС, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Юрый СЯНЬКО:**



— Паслухаўшы Пасланне кіраўніка дзяржавы, усе засталіся задаволеныя яго заявамі, у тым ліку адказамі на пытанні дэлегатаў, дзе былі нюансы, удакладненні пытанняў, якія цікавяць. Выступленне Прэзідэнта дало дакладныя тлумачэнні падыходаў і пазіцыі нашай краіны па пытаннях міжнароднай і ўнутранай палітыкі. Усе гэтыя пытанні вельмі важныя. Выступленне было вельмі магутным. Кіраўнік дзяржавы разабраў кожнае пытанне і пашырыў іх. Як вялікі палітык, валодаючы вялізным аб'ёмам інфармацыі, ён акумуляваў яе і паказаў усім дэлегатам Усебеларускага народнага сходу. Гэта вельмі важная заява. Паверце, такую абсалютна дакладную інфармацыю мы можам атрымаць толькі на такім мерапрыемстве. Гэта вялікая падзея сённяшняга дня.

**Дэлегат УНС, старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Савета Рэспублікі Міхаіл РУСЫ:**



— Дзякуючы рэалізацыі сацыяльна-эканамічных праграм у краіне створаны канкурэнтаздольны АПК. Захаваны і ўзняты на высокую прыступку развіцця машынабудаўнічы комплекс. Нашы камбайны і трактары канкуруюць у свеце па прадукцыйнасці і энергаэфектыўнасці. І самае галоўнае — мы ні ад каго не залежым. Што датычыцца вёскі, сёлета мы прадалі прадукцыі сельскай гаспадаркі на больш чым 9 мільярдаў долараў. Мы ўжо даўно забяспечылі сваю харчовую бяспеку, і цяпер Беларусь актыўна ўдзельнічае ў паляпшэнні сусветнай харчовай бяспекі. Паглядзіце на сегменты экспартных пастаўак — алей, сухое малако, сыры. Па гэтых пазіцыях мы займаем лідзіруючыя пазіцыі ў свеце. Калі ўспомніць развал Савецкага Саюза, у краіне хлеба было толькі на тры дні. А сёння мы забяспечаны харчаваннем у поўным аб'ёме. Усё гэта зрабілі нашы людзі.

**Член УНС, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Дзмітрый ШАЎЦОЎ:**



— Пасланне, традыцыйна, ідзе заўсёды ад сэрца Прэзідэнта, знутры глыбіні яго душы. І таму сённяшняе Пасланне — не выключэнне. Разам з тым заўсёды і гэтым разам Аляксандр Рыгоравіч дае пасылы развіцця дзеючай сітуацыі. Вельмі шмат увагі было ўдзелена знешняму вектару. Але разам з тым тыя задачы, аб якіх казаў наш Прэзідэнт, яны вельмі важныя. Калі мы гаворым пра дэмаграфічную бяспеку, пра развіццё навукаёмістасцяў, пра чалавечы патэнцыял — гэта таксама вельмі важны аспект, напэўна, адзін з самых галоўных аспектаў. Калі мы гаворым пра развіццё нашай краіны ў цэлым, у кантэксце з выхадам на знешнія рынкі, на тыя падножкі, якія нашы канкурэнты спрабуюць нам паставіць, то гэта вельмі такі фундаментальны вектар развіцця на перспектыву нашай краіны.

**Дэлегат УНС, кіраўнік Ашмянскага раённага цэнтра для забеспячэння дзейнасці бюджэтных арганізацый і дзяржаўных органаў Лілія НЕВЯРКЕВІЧ:**



— Прэзідэнт закрануў шэраг найважнейшых пытанняў у сваім Пасланні. Дэмаграфічныя, пытанні развіцця аховы здароўя, культуры, спорту і многіх іншых сфер. На мой погляд, вельмі важна, што Аляксандр Рыгоравіч сканцэнтраваў сваю ўвагу і на эканоміцы, ад якой залежыць наша будучыня. Прэзідэнт у Пасланні арыентаваў нас, што настаў час канкрэтных спраў. Ад таго, як кожны выконвае сваю работу на месцы, залежыць жыццё і яго якасць. Выступленне Прэзідэнта мне асабіста надало імпульс для далейшых працоўных здзяйсненняў.

**Дэлегат УНС, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях Аляксандр КАНАПАЦКІ:**



— Вядома ж, для сябе, як прадстаўніка Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях, адзначыў шэраг кірункаў, якія датычацца сацыяльных пытанняў. І рэалізацыі тых механізмаў, якія будуць датычыцца кожнага беларуса, кожнай беларускай сям'і, калі гаворка ідзе аб дэмаграфіі, то гэта, зноў жа, рынак працы, беспрацоўе. Якія неабходна распачаць дзеянні? Павышэнне чаканай працягласці жыцця. Вядома ж, павышэнне якасці жыцця. Калі рэзюмаваць усё вышэйадзначанае, ключавы пасыл быў звернуты на глабальнае павышэнне якасці жыцця кожнага беларуса. Гэта і размова аб геапалітычных працэсах, якія сёння адбываюцца ў свеце, за межамі нашай краіны. Гэта глабальныя мэты, якія сёння бачаць беларусы ў маленькім населеным пункце, у буйным абласным цэнтры. Але пасыл быў адрасаваны канкрэтна, прадметна кожнаму. І кожны для сябе выйшаў з залы з разуменнем дзеянняў на бліжэйшыя пяць гадоў.

**Удзельнік УНС, начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

# НАШ АГУЛЬНЫ ДОМ

Зварот Прэзідэнта з Пасланнем беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь — гэта падзея, якая не пакінула раўнадушным нікога. Не толькі дэлегаты УНС, але і літаральна ўся краіна слухала і глядзела яго — у дамах, на прадпрыемствах, у аўтамабілях. Бо гэта не проста зварот, а шчырая размова лідара краіны са сваім народам, тым самым, дзеля якога жыве і працуе наш Прэзідэнт.

Ніжэй — уражанні тых, хто глядзеў і слухаў выступленне Прэзідэнта ў рэгіёнах.

**Глыбоцкага райвыканкама Людміла КАРНІЛОВІЧ:**



— Кожная тэма, да якой звяртаўся Прэзідэнт нашай краіны ў сваім Пасланні, вельмі важная і актуальная. Самае галоўнае ў маёй працы — аснова ідэалогіі беларускай дзяржавы, якую важна данесці да кожнага жыхара раёна. Асноўныя сілы будзем арыентаваць на моладзь. Як акцэнтаваў увагу Аляксандр Рыгоравіч, за моладдзю — будучыня. Важна даносіць да юнакоў і дзяўчат правераную інфармацыю, каб яны з цвёрдым розумам і адкрытым сэрцам будавалі гісторыю свaёй краіны.

**Дэлегат УНС, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Ігар МАРЗАЛЮК:**



— Любое Пасланне Прэзідэнта вызначае найважнейшыя тэма, а ў дадзеным выпадку, калі мы гаворым аб пасланні Прэзідэнта, гэта вызначэнне стратэгіі будучыні на бліжэйшыя пяць гадоў. Я не буду пераказваць усе тэзісы. Калі адной фразай — гэта якраз той выпадак, калі паняцце таго, што эканоміка — канцэнтраваная палітыка, альбо палітыка — гэта канцэнтраваная эканоміка, называйце гэта як заўгодна, лепш за ўсё падыходзіць да гэтага моманту. І другі момант. Гаворачы аб эканамічных праблемах, аб пунктах росту, Прэзідэнт пастаянна акцэнтаваў увагу на найважнейшым момансе з майго пункту гледжання — на суверэнітэце краіны. Ну і яшчэ адзін тэзіс: не бывае вялікіх і малых народаў, не бывае нікчэмных і малых народаў, кожны народ вялікі па-свойму і апеляцыя да беларускага народа і разуменне таго, што для Аляксандра Лукашэнкі беларускі народ — гэта вялікі народ. Любоў і цеплыня, якія былі ў працэсе ўсяго пасяджэння, — пра гэтыя рэчы трэба памятаць, таму што, калі мы любім, мы імкнёмся зрабіць магчымае і немагчымае, мы рвём гарызонт і выходзім за перыметр штодзённасці. Вось гэта быў прарыў у будучыню — мара аб вялікай будучыні чалавека, які зрабіў нашу вялікую сучаснасць.

**Дэлегат УНС, старшыня Гаранскага сельскага Савета дэпутатаў Вольга АНТОНЕНКА:**



— Паколькі я з'яўляюся старшынёй сельскага Савета, мяне цікавілі пытанні добраўпарадкавання, дэмаграфіі ў нашай краіне і ў нашым рэгіёне. Таксама, вядома ж, усе нашы людзі перажываюць з-за сітуацыі, звязанай з Украінай. Прэзідэнт расказаў больш падрабязна аб усіх хвалюючых пытаннях. І мы ведаем і верым, што ўсё будзе добра. Магу сказаць, што многія людзі адчуваюць сябе ўпэўнена ў нашай краіне. Яны ведаюць, што ў іх ёсць або ў хуткім часе будзе жыллё, ёсць пастаянная праца, стабільны заробак. У сельскай мясцовасці дзяржавай ствараюцца ўсе неабходныя ўмовы для жыцця людзей. Нашы людзі, як і ўсе ў свеце, хочуць жыць яшчэ лепш. Гэта правільна, але, як і сказаў Прэзідэнт, мы ўсе павінны для гэтага нешта рабіць. А дзяржава нам у гэтым дапамагае.

**Вядучы спецыяліст па ідэалагічнай рабоце санаторыя «Баравое» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, старшыня Докшыцкай раённай структуры РГА «Патрыёты Беларусі» Алена КУРНЫШ:**



— Зварот нацыянальнага лідара да свайго народа выклікаў вялікую цікавасць з боку маіх калег і паплечнікаў. Ведаю, што тыя, хто не быў заняты на працы падчас тэлетрансляцыі, глядзелі яе. Спяшаліся ўключыць тэлевізары і тыя, хто вярнуўся дадому. Уражвае, што Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка ўдзяліў увагу кожнаму «пазлу», з якога складаецца наша краіна і яе знешні контур. Гэта сапраўды аб'ёмная і падрабязная размова са сваім народам аб тым, што турбуе кожнага з нас.

Хочацца выдзеліць некалькі момантаў, якія закранулі асабіста мяне. Жыццё кіпіць не толькі ў сталіцы ці абласных цэнтрах — у глыбінцы мы таксама імкнёмся да лепшага. Докшыцкі раён, мая Бягомльшчына — гэта ўязныя вароты ў Віцебскую вобласць з Мінскай. Мы здольны ўразіць гасцей, у тым ліку прымаючы іх у санаторыях «Баравое» і «Лясное», дзе значную частку адпачывальнікаў складаюць расіяне. І яны вельмі паважліва гавораць пра нашага Прэзідэнта, пра чысціню, захаванне спакою і правапарадку, якасць аздараўленчых паслуг, якія ў нас атрымліваюць нашых тавараў.

У нашым санаторыі будуецца чацвёрты дадатковы корпус з лячэбным блокам, басейнам, СПА-зонай. Плануецца ўвесці яго ў эксплуатацыю ў 2027 годзе. У перспектыве гэта азначае стварэнне каля 60 новых працоўных месцаў і дадатковага ложкавага фонду. Будзе больш гасцей — павялічыцца аб'ём выручкі ад рэалізацыі і экспарту паслуг. Гэта адпавядае тэзісу Прэзідэнта аб павелічэнні ўдвая выручкі ад турызму.

Яшчэ хочацца выказаць салідарнасць з думкай кіраўніка дзяржавы аб перавагах тавараў айчыннай вытворчасці перад экспартнымі. Асабіста я купляю беларускае для ўсёй сям'і — ад мэблі да вопраткі і абутку, тавараў штодзённага попыту і прадуктаў. Падтрымліваючы сваіх вытворцаў, якія выпускаюць прадукцыю з рэальнымі суадносінамі якасці і кошту, мы падтрымліваем эканоміку сваёй краіны.

**Вядучы спецыяліст Цэнтра па сувязях з грамадскасцю ГрДУ імя Янкі Купалы Арсеній СІДАРКЕВІЧ:**



— Вядома, я глядзеў Пасланне Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу. Кіраўнік дзяржавы спыняўся на вельмі важных аспектах. Мяне, маладога спецыяліста, асабліва закрануў тэзіс «Моцныя рэгіёны — моцная краіна». Прэзідэнт заклікаў беларусаў не імкнуцца ў сталіцу, а заставацца ў сваіх рэгіёнах і ствараць праекты для іх развіцця. Ён зазначыў, што чалавечы фактар адыгрывае ключавую ролю ў гэтым працэсе і ад кожнага беларуса залежыць будучыня краіны. Я сам родам з раённага цэнтра і кожны год адзначаю, наколькі мая малая радзіма мяняецца. Хочацца адзначыць, што Аляксандр Рыгоравіч гаворыць прама і падтрымлівае важнасць адкрытага дыялогу з народам. Яго зварот, як заўсёды, быў шчырым. І нават такія няпростыя тэмы, як эканоміка, ён умее данесці да кожнага.

Натуральна, нельга адмаўляць значнасць Усебеларускага народнага сходу як органа, які прымае найважнейшыя рашэнні. Гэта сімвал адзінства беларускай нацыі, а таксама сімвал сапраўднай дэмакратыі. І цяпер сапраўды час канкрэтных спраў і рашэнняў. Год добраўпарадкавання і пяцігодка якасці паказалі, што гэта не пустыя словы. За апошнія гады было столькі ўсяго зроблена, што адразу і не пералічыш. І, што самае важнае, кожны беларус разумее: толькі ад яго залежыць, у якой дзяржаве ён і яго сям'я будуць жыць.

Вядома, другі дзень пасяджэння таксама не менш важны. Будзе разглядацца Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 5 наступных гадоў. Упэўнены, што яна будзе прынята, бо над ёй старанна працавала вялікая колькасць людзей, прафесіяналаў сваёй справы. Усе сем прыярытэтаў — гэта слупы, на якіх будуецца дзяржаўны ўклад.

**Старшыня Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў, старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА:**

— У Пасланні Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту ўразіў той клопат кіраўніка дзяржавы ў дачыненні да кожнага беларуса, тыя важныя тэзісы, якія датычацца сёння ўсіх незалежна ад узросту, прафесіі, тэрыторыі пражывання. Як дакладна і ёмка адзначыў Прэзідэнт, сёння час канкрэтных спраў! Таму так важна памятаць пра тыя галоўныя «маякі», якія раскрываюцца ў адказах на два простыя пытанні: чаго мы чакаем ад дзяржавы і што гатовы і павінны кожны на сваім месцы зрабіць, каб захаваць у краіне звыклы і камфортны для нас сацыяльна-арыентаваны ўклад? Сапраўды, як падкрэсліў наш лідар, адказы на гэтыя пытанні і вырашаюць стратэгію далейшага развіцця краіны.



Як дэпутата мяне асабліва закранула тэма добраўпарадкавання, навядзення парадку ў населеных пунктах. Так, як правільна зазначыў Аляксандр Рыгоравіч, Беларусь — чыстая краіна. І нашы людзі так прывыклі да таго, што ўсюды прыбрана, прыгожа, утульна, што забываюць: за гэтым стаіць вялікая работа людзей. Год добраўпарадкавання, як нагадаў Прэзідэнт, падыходзіць да завяршэння, але наладжаны працэс па добраўпарадкаванні павінен захоўвацца. Кіраўнік дзяржавы скіраваў увагу на тое, што паўсюдна павінен быць гаспадарчы падыход. Бо, як правільна нагадаў кіраўнік дзяржавы, Беларусь — наш агульны дом, аб якім трэба клапаціцца і які трэба берагчы.

Безумоўна, кранула ў выступленні і тэмы беларускай вёскі, замацавання моладзі, спецыялістаў, работнікаў у аграгарадках, буйных пунктах сельскай мясцовасці, каб пазбегнуць дысбалансу развіцця, новыя падыходы да матывацыі моладзі, маладых сямейных пар для замацоўвання іх у сельскай мясцовасці.

**Мікалай БАРЫСЕНКА, ваенны пісьменнік, гісторык, кіраўнік Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру»:**



— Прамова Прэзідэнта, як заўсёды, была насычана моцнымі пасыламі. У ёй закрануты ўсе жыццёва важныя праблемы для насельніцтва. Аналагаў у сусветнай гісторыі такому агульнадзяржаўнаму сходу, як наш Усебеларускі народны, няма. У нашай дзяржаве выпрацаваны такі механізм, калі ў жыцці краіны можа ўдзельнічаць кожны з нас — праз дэлегатаў, народных дэпутатаў, асабісты зварот, праз сустрэчы, прамыя лініі. Гэта дарагога варта. І няхай пасля гэтага хто-небудзь з празаходніх палітыкаў скажа, што ў нас няма дэмакратыі. Гэта яшчэ вялікае пытанне, дзе яе больш: у Еўропе ці ў нас.

Удзельнічаючы ў папярэдніх УНС, адчуў на сабе асабіста, як гэта адказна, калі Прэзідэнт звяртаецца наўпрост да народа. Гэты, сёмы па ліку, Усенародны беларускі сход накіраваны на развіццё краіны на найбліжэйшыя пяць гадоў, і ў гэтым развіцці павінен паўдзельнічаць кожны. На жаль, хапае такіх, хто індыферэнтна адносіцца да палітыкі. Але сёння нельга быць абыякавым. І пра гэта зноў нам нагадаў Прэзідэнт. Вельмі неспакойная сёння знешнепалітычная абстаноўка. Краіна, па сутнасці, знаходзіцца ў варожым асяроддзі. І гэта не можа не напружваць перш за ўсё таму, што, як ужо неадназова гаварылася, хочаш пазбегнуць вайны — рыхтуйся да яе. Толькі з моцнымі краінамі лічацца ў свеце. Усе гэтыя размовы еўрапейскіх палітыкаў нічога не вартыя. Гэта проста балбатня, якая ўсыпляе і закалыхвае. Насамрэч усё значна складаней...

У нас на генетычным узроўні працуе гістарычная памяць. Яшчэ жывое пакаленне, якое памятае страшныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Асабліва моцна кажуць за сябе факты генацыду. Практычна кожную беларускую сям'ю закранула вайна. Нам пра гэта тлумачыць не трэба. Мы гэта добра разумеем і памятаем. А цяпер і моладзь падцягнулася. Дзяржава робіць усё для таго, каб захаваць гістарычную аб'ектыўную праўду і не даць нядобразычліўцам — цяперашнім нашчадкам былых калабарантаў за мяжой — перапісаць гісторыю.

**Кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні магілёўскай СШ № 46 Аляксандр КІРКАЛАЎ:**



— Наш Прэзідэнт — моцны лідар, які вядзе краіну наперад. Асабліва блізкая мне тэма патрыятычнага выхавання, паколькі сам гэтым займаюся. Мэты, якія мы вызначаем як галоўныя ў выхаванні патрыятызму ў падрастаючага пакалення, — гэта заўсёды адказ на два простыя пытанні: што мы даём нашым дзецям у ідэалагічным плане і які прыклад падаём ім? Шчыра адказаўшы на гэтыя пытанні, сапраўды зразумеем, ці зможам мы смела глядзець у будучыню, выхоўваючы маладое пакаленне беларусаў. Наша будучыня — у руках нашых дзяцей. І што мы ў іх выхаваем сёння, тое і пажнём заўтра. Патрыятызм — не проста высокія словы, гэта перш за ўсё добрыя ўчынкі і карысныя справы. Разам з навучэнцамі даследуем гісторыі іх сямей. Праз гэтую прызму яны далучаюцца да гісторыі краіны і ўмеюць адрозніць, дзе праўда, а дзе падман.

**Па паведамленнях нашых карэспандэнтаў.**

# «СВЕТ БУДЗЕ АБСАЛЮТНА ІНШЫМ,

## Аб чым яшчэ Аляксандр Лукашэнка гаварыў



У гэтым блоку пытанняў, якія ў суботу Прэзідэнту Беларусі задавала вядучая праграмы «Хроніка з Грэтай Ван Састэрэн» тэлеканала «Ньюсмакс ТВ» тэлекампаніі «Ньюсмакс» Грэта Канвей Ван Састэрэн, кіраўнік дзяржавы падзяліўся, чым яму блізкая палітыка, якую цяпер праводзіць Дональд Трамп, выказаў сваё бачанне наконт будучыні беларуска-амерыканскага ўзаемадзеяння. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка расказаў аб асабістых уражаннях ад камунікату з лідарамі Расіі, Кітая, Паўночнай Карэі.

### ПРА ДОНАЛЬДА ТРАМПА. «МОЦНАЯ ФІГУРА»

Журналіст пацікавілася, чаму беларускаму лідару падабаецца цяперашні Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп. «Па-першае, прабачце нясціпласць пэўную, я быў адзіным Прэзідэнтам, які не толькі «хварэў» за Трампа, калі ён вылучыў сваю кандыдатуру ў прэзідэнты, але і адкрыта аб гэтым гаварыў, — заўважыў беларускі лідар. — За яго многія перажывалі, я думаю, але вось так, у адкрытую, выступаць за Трампа, як гэта зрабілі тут, у Беларусі, нідзе гэтага не было. На жаль, у Амерыцы гэтага не ведаюць, бо Беларусь дагэтуль узначальвае «апошні дыктатар Еўропы» або як вы там мяне называлі».

Па-другое, па словах Аляксандра Лукашэнкі, палітыка, якую цяпер праводзіць Дональд Трамп, блізкая да пазіцыі беларускага лідара і да той палітыкі, якая праводзіцца ў Беларусі. «Хоць Джон (Коўл, спецпасланнік ЗША ў Беларусі. — **«Зв.»**) быў сведкам, я яму ў першую сустрэчу выказаў пэўныя крытычныя заўвагі ў адносінах палітыкі Трампа, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Таму я не з'яўляюся сляпым прыхільнікам Трампа, але я заўсёды вітаў тое, што Трамп прыйдзе да ўлады. Ен сябе паказаў бліскуча. Я яго называў у прадвыбарнай кампаніі «бульдозер»: ён прайшоў па краіне, як бульдозер, і перамог».

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што не думаў аб тым, што перамога Дональда Трампа ў выбарах будзе такой аглушальнай. «Ен гэту перамогу заслужыў, — падкрэсліў Прэзідэнт. — І нават Гасподзь яго пашкадаваў, ён (Дональд Трамп. — **«Зв.»**) гэта прызнае. Таму з якога боку ні паглядзі: Трамп — моцная фігура».

Аляксандр Лукашэнка даў высокую ацэнку апошнім дакументам, прынятым у ЗША, у прыватнасці знешнепалітычнай дактрыне. «Гэта калі ажыццявіцца, для свету будзе падарунак, — лічыць беларускі лідар. — Гэта значыць, у знешняй палітыцы па меншай меры Трамп зрабіў нямала. Сем або восем войн спыніў або канфліктаў — не важна. Але ён на гэта накіраваны і ў яго нешта атрымліваецца. І калі канфлікт ва Украіне пры дапамозе Трампа будзе спынены, ён увойдзе ў гісторыю. Яму не трэба ніякая Нобелеўская прэмія. Ен увойдзе ў гісторыю як самы міралюбівы Прэзідэнт Злучаных Штатаў Амерыкі, чаго не скажаш аб іншых пасля Рузвельта».

Па словах кіраўніка дзяржавы, шмат станоўчага можна гаварыць пра Дональда Трампа. «Я не расчараваны, што яго такім чынам падтрымліваў, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Асабліва на фоне той адміністрацыі, якая спрабавала сілай нахіліць увесь свет: і эканамічна, і ваенным чынам. Трамп у гэтым адрозніваецца. Ен на сённяшні дзень робіць усё правільна. І тое, што вы (маю на ўвазе Трампа) цяпер кінулі погляд свой не толькі на знешнюю палітыку, а сталі разбірацца ва ўнутранай палітыцы, унутрыпалітычных пытаннях, эканамічных пытаннях — гэта ў цэль і вельмі правільна».

### ПРА УЛАДЗІМІРА ПУЦІНА. «У ПАЛІТЫЦЫ — ВАЛКАДАЎ»

Адказваючы на пытанне, ці сустракаўся Аляксандр Лукашэнка з Уладзімірам Зяленскім, беларускі лідар адказаў, што сустракаўся. Журналіст пацікавілася ў Прэзідэнта Беларусі, які Зяленскі як чалавек.

«Мне падалося тады, свядомы чалавек, але нявопытны, — канстатаваў ён. — Аднак гэта натуральна, калі пра палітыку гаварыць. Што датычыцца асабістых пэўных якасцяў, я не настолькі блізкі з ім, як з Пуціным або з Сі Цзіньпінам».

Адказваючы на пытанні, якім чалавекам з'яўляецца Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што чалавечыя якасці ў яго расійскага калегі вельмі добрыя.

**«Але ў палітыцы — валкадаў, — канстатаваў Прэзідэнт. — Ён у палітыцы вялікі чалавек. Даўно кіруе такой вялікай краінай. Таму можна пазайздросціць яго жаданню і ўменню кіраваць краінай і займацца пытаннямі не толькі ўнутранай, а і знешняй палітыкі. Ён моцны чалавек».**

### ПРА СІ ЦЗІНЬПІНА. «РАЗУМНЫ, АКУРАТНЫ, СПАКОЙНЫ»

Закранула журналіст і ўзаемаадносіны Аляксандра Лукашэнкі з лідарам КНР, заўважыўшы, што беларускі лідар ведае Сі Цзіньпіна вельмі добра.

«Я ж вам сказаў, што ў мяне сваяк, старэйшы брат, Уладзімір Пуцін і мой сябар Сі Цзіньпін, з якім мы з даўніх часоў сябры», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Які ён чалавек?» — удакладніла інтэрв'юер.

«Ен кітаец. Гэта значыць, што ён разумны, акуратны, спакойны да немагчымасці, як усе кітайцы. Гэта іх асаблівасць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Яны нікуды не спяшаюцца. Гэта разумныя людзі (цывілізацыя найстаражытнейшая), якія разумеюць: рана або позна праблема, якая існуе, павінна быць вырашана. Яны лічаць, што паскараць гэты працэс бескарысна: можна нарвацца на непрыемнасці. А ціха, спакойна робяць сваю справу».

Беларускі лідар узгадаў, што ўпершыню трапіў у Кітай больш як 30 гадоў таму.

**«Я тады заўважыў, што за Кітаем вялікая будучыня, — канстатаваў ён. — І будучы дэпутатам (кадры ёсць) прыехаў і сказаў у парламенце: «Нам трэба выбудоўваць адносіны з кітайскай**

# І Ў КАРОТКІ ПРАМЕЖАК ЧАСУ»

## у інтэрв'ю амерыканскай тэлекампаніі

**дзяржавай. Там вялікая будучыня». Ну, амерыканцы тады, ведаеце, не вельмі з намі сябравалі і сябраваць не хацелі. Еўрапейцы таксама мяне спрабавалі заблытаць рознага кшталту дэмакратыяй і гэтак далей. Але я бачыў эканоміку перш за ўсё, бачыў, што Кітай будзе развівацца. Прайшло 25-30 гадоў — Кітай выбіваецца ў лідары. Ён нават насцярожыў вас (ЗША. — «Зв.»), вы спрабуеце стрымаць развіццё Кітая».**

У гэтай сувязі Прэзідэнт узгадаў візіт у Беларусь былога Дзяржсакратара ЗША Майка Пампеа і экс-саветніка Прэзідэнта ЗША па нацбяспецы Джона Болдана. «Я іх пераконваў, што Кітай спыніць сёння немагчыма, — узгадаў дэталі той размовы кіраўнік дзяржавы. — Вы страцілі як мінімум 20 гадоў для таго, каб стрымаць Кітай. Кітай сёння ніхто не ў стане стрымаць, асабліва з той філасофіяй, якая ў кітайцаў у галаве».

Журналіст спытала ў беларускага лідара, што адбылося за гэтыя 20 гадоў з Кітаем. «Я Кітай бачыў на працягу 30 гадоў, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Яны здзяйсняюць кожны год «рэвалюцыю». Прыязджаю туды кожны год і не пазнаю Кітай. Яны настолькі эфектыўныя, што вы нават ацаніць гэтага не можаце».

У гэтай сувязі Прэзідэнт пракаменціраваў апошнія рашэнні Злучаных Штатаў Амерыкі, пра якія даведаўся са сродкаў масавай інфармацыі, аб тым што Дональд Трамп гатовы стварыць блок з пяці дзяржаў, куды ўвойдуць Расія, Кітай, Японія, Злучаныя Штаты Амерыкі і Індыя. «Калі гэты саюз адбудзецца, свет будзе абсалютна іншым, і ў кароткі прамежак часу, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Неверагодна. Ну, напэўна, пасля таго, як еўрапейцы не разумеюць, чаго хоча Трамп, Трамп звярнуўся ў Азію, бо там — галоўныя цэнтры развіцця, будучыні развіцця. Сёння Азія развіваецца бурнымі тэмпамі, перш за ўсё дзякуючы Кітаю. Таму Кітай ёсць Кітай. Старажытная цывілізацыя. Спакойна, нікуды не спяшаюцца, і з гэтым трэба пагадзіцца».

### ПРА КІМ ЧЭН ЫНА. «ПРЫСТОЙНЫ, СПАКОЙНЫ, СУМЛЕННЫ ЧАЛАВЕК»

Грэта Канвей Ван Састэрэн спытала, ці сустракаўся беларускі лідар з кіраўніком КНДР і якія ў яго ўражанні ад камунікату з Кім Чэн Ынам. Аляксандр Лукашэнка сустракаўся з паўночнакарэйскім лідарам на парадзе ў Кітаі, у верасні гэтага года.

«Нармальнае ўражанне, — падзяліўся кіраўнік дзяржавы. — Трамп таксама думаў, што гэта (Кім Чэн Ын. — **«Зв.»**) невядома які чалавек. Але калі сустрэўся з ім у першы тэрмін, калі там бываў, ён нармальна аб ім адзываўся, я — таксама. Уражанне маё аб Кім Чэн Ыне са сродкаў масавай інфармацыі. Але калі я з ім пагаварыў, я ўбачыў абсалютна нармальнага чалавека, які ведае сваё месца ў свеце. Ен не з'яўляецца нейкім там фантомам. Ен прыстойны, спакойны, сумленны чалавек. Гэта ж кароткая была сустрэча, але ў мяне склалася такое ўражанне. Упэўнены, маё ўражанне не падманнае. З ім можна дамовіцца».

### ПРА АДНОСІНЫ З ЗША. «КАЛІ МЫ ВЫЗНАЧЫМСЯ ПА АСОБНЫХ КІРУНКАХ НАШАГА ПРАГМАТЫЗМУ, МЫ ДАМОВІМСЯ»

Гаворачы аб перспектывах адносін паміж Беларуссю і ЗША, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што са Злучанымі Штатамі Амерыкі можна дамовіцца. «Мы вельмі падобныя, — удакладніў ён. — У нас — еўрапейскія карані, таму я ўпэўнены, што мы дамовімся. Можа быць, на рэйках прагматызму. Амерыканцы — людзі выключна прагматычныя. Мы — таксама. Таму, я думаю, калі мы вызначымся па асобных кірунках нашага прагматызму, мы дамовімся».

Некаторыя прапановы беларускага прагматызму Прэзідэнт перадаў Джону Коўлу, спецпасланніку ЗША ў Беларусі. «Яны ляжаць у плоскасці інтарэсаў Злучаных Штатаў Амерыкі, — праінфармаваў Аляксандр Лукашэнка. — Трэба дамаўляцца...

Мы чаго з амерыканцамі маем дрэнныя адносіны? Што мы зрабілі дрэннага для Злучаных Штатаў Амерыкі? Нічога. Дык чаму вы на нас глядзіце коса? Я думаю, у выніку нашага дыялогу, які ў нас ідзе, мы аб усім дамовімся».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што падчас нядаўніх перагавораў з амерыканцамі сказаў:

**«Хлопцы, трэба ўмець прызнаваць паражэнне». «Калі вы нават такая буйная краіна, як ЗША, і калі вы ў 2020 годзе, арганізаваўшы супраць нас атаку (не вы асабіста, але вы былі прыхільнікамі гэтага), прайгралі, — ну, трэба выходзіць з гэтага. Не трэба хадзіць і крычаць па свеце: «Мы прайгралі». Але трэба выходзіць з гэтага: прайгралі — давайце сядзем спакойна, па-мужчынску будзем рухацца далей».**

Рэзюмуючы, Прэзідэнт заўважыў, што хацеў бы, каб у яго асабіста, у Беларусі былі добрыя адносіны з ЗША. «Слухайце, я сыходзячы Прэзідэнт (я часта пра гэта гавару), і я не хачу, каб праблемы, якія ўзніклі ў перыяд майго кіравання краінай, былі перакладзены на новае пакаленне, — растлумачыў беларускі лідар. — Кожнае пакаленне свае праблемы само павінна вырашаць. Вось у нашага пакалення (у Трампа, у Лукашэнкі) ёсць праблемы, мы іх павінны вырашыць».

Больш таго, па словах Прэзідэнта, у абедзвюх краін ёсць агульныя пытанні, дзе яны могуць дапамагчы адзін аднаму. «Вось вы пачалі гаварыць па Венесуэле, — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — Мы можам разам там працаваць? Можам. Я ўчора (12 снежня. — **«Зв.»**) Джону Коўлу сказаў — бясплатна, мне не трэба нічога плаціць, бясплатна будзем разам працаваць у інтарэсах таго, каб і венесуэльскі народ жыў у міры, і амерыканцы не гінулі на чужой зямлі. Дзеля нейкіх там нафты, золата, рэдказямельных металаў або ў барацьбе з наркотыкамі і іншае. Там, дзе ёсць магчымасць захаваць жыццё, трэба гэта захаваць, таму мы дамовімся з амерыканцамі. Мы дамовімся».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**



Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ООО «Величковичи-АГРО», Минская обл., Солигорский р-н, Копацевичский с/с, аг. Величковичи, ул. Ленина, д. 16. УНП 693179004 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**
Адрес: Солигорский р-н, Копацевичский с/с, аг. Величковичи, ул. Ленина, д. 16

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, руб. |
|---|---|---|
| 1 | Трактор NEW HOLLAND T 8040, OB-5 2846, 2007 г. в. | 74 100,00 |
| 2 | Трактор FENDT-930, ОМ-5 8070, 2006 г. в. | 171 000,00 |
| 3 | Погрузчик с телескопич. стрелой Амкадор-527, ОК-5 1810, 2011 г. в. | 44 460,00 |
| 4 | Сеялка Avatar 6.16 SD, сер. № 21271452, 2019 г. в. | 228 000,00 |
| 5 | Пресс-подборщик LSB 1270-10H3001, 2010 г. в. | 171 000,00 |
| 6 | Культиватор-окучник ОКГ-4 гребнеобразователь, 2006 г. в. | 12 540,00 |
| 7 | Культиватор SYNKRO 3003K стержневой, 2008 г. в. | 31 920,00 |
| 8 | Комбайн картофелеубороч. ПКК-2-05 прицепной, 2009 г. в. | 103 740,00 |
| 9 | Картофелесажалка СК-4 полунавесная четырехрядная, 2012 г. в. | 42 180,00 |
| 10 | Картофелесажалка КС-4 с протравливателем и обор. внесения мин, 2009 г. в. | 31 920,00 |

Цена снижена на 5 %. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

